Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 225 (5958)
КАСТРЫЧНІКА
8
ПАНЯДЗЕЛАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Тав. ГІКАЛО НА ВЫСТАЎЦЫ ПРОМКААПЕРАЦЫІ БССР

Учора сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО, нарком унутраных спраў тав. ЗАКОЎСКІ і загадчык промаддзела ЦК КП(б)Б тав. ГОТФРЫД наведалі выстаўку промкааперацыі БССР.

Таварышы Гікало і Закоўскі ўважліва агледзелі прадстаўленыя на выстаўцы экспанаты, адлюстроўваючыя рост розных вытворчасцей і промарцелей БССР. Асабліва падрабязна таварышы Гікало і Закоўскі агледзелі новыя віды вытворчасцей, вырабляючых прадметы шырокага сялянскага ўжытку. Вялікую ўвагу тав. Гікало звярнуў на якасць прадукцыі.

Тав. Гікало прапанаваў арганізаваць у Менску універсальны магазін вырабаў сампромкааперацыі.

Тав. Гікало таксама ўхваліў мерапрыемствы сампромсоветаў аб выдачы дыпломаў і водгукаў па пастанове журы выстаўкі арцелям, якія прымаюць удзел у выстаўцы.

Промкааперацыя, як паказвае выстаўка, мае ўсе магчымасці вырабляць з мясцовай сыравіны добраякасныя тавары, з якіх многія раней увозіліся ў БССР з розных абласцей і краёў Саюза.

Працоўныя гарадоў Беларусі праявілі вялікую зацікаўленасць да выстаўкі. Выстаўку наведала ўжо каля 17 тыс. чалавек.

ЎЛІЧЫЦЬ НЕДАХОПЫ ПЕРШЫХ ДЗЁН ПАРТВУЧОБЫ

Пастанова ЦК КП(б)Б аб разгортванні марксісцка-ленінскай вучобы ў надыходзячы асенне-зімовы перыяд мае выключна важнае значэнне. Яна абавязвае гаркомы, райкомы і палітаддзелы МТС і соўгасы «крыняць рашучыя меры да разгортвання асенне-зімовай партвучобы, паставіўшы ў цэнтр увагі барацьбу за высокую якасць прапаганды ленінізма і рашэнняў XVII з'езда партыі, ахоп вучобай усіх членаў, кандыдатаў партыі і спачуваючых».

Вопыт першых дзён заняткаў гарадскіх школ зусім ясна лаказаў, што ў гадзе партарганізацыі якасць большэвіцкай прапаганды не адпавядае ўказанням ЦК ВКП(б) аб разгортванні марксісцка-ленінскай вучобы. Факты правядзення заняткаў партыйных школ на менскіх заводах «Большэвік» і «Ударнік» у непрыстасаваных для вучобы брудных памяшканнях, адсутнасць належнай колькасці падручнікаў, крослаў для слухачоў ні ў якім разе не можа забяспечыць выканання дырэктывы ЦК аб якасці вучобы.

Адсутнасць прапрацоўкі матэрыялаў слухачамі дома, якая выявілася ў першыя дні заняткаў, прымушала прапагандыстаў прымяняць выключна лекцыйны метад заняткаў і чытку матэрыялаў, што безумоўна паніжае якасную і колькасную прапрацоўку праграмы.

Партыйныя камітэты абавязаны правяраць, як комуністы працуюць над матэрыяламі дома, дапамагчы ім у гэтым.

Пастанова ЦК КП(б)Б асабліва падкрэслівае важнасць падбору і падрыхтоўкі прапагандыстаў. Райкомы партыі, палітаддзелы МТС і соўгасаў абавязаны «выключаных для работы ў секцыі партасветы прапагандыстаў прапусціць праз спецыяльныя адборачныя камісіі. Да заняткаў дапускаць прапагандыстаў толькі пасля дакладнай праверкі і зацвярджэння на бюро горрайкомаў і палітаддзелаў».

Між тым рад райкомаў яшчэ да пятага часу нічога не робяць у сэнсе адбору прапагандыстаў. Ці можна да гэтага часу аставацца ў абсалютным спакоі, як гэта робіць касцюковіцкі райком партыі ў пытанні падбору і падрыхтоўкі прапагандыстаў? Райком партыі супроць дырэктыў ЦК КП(б)Б ускладае ўсю падрыхтоўку да партыйнай вучобы на партгабінет, у якім нават няма яшчэ загадчыка.

ЦК КП(б)Б папярэджвае ўсе партарганізацыі супроць спроб ускласці на партгабінеты функцыі былых культпропаў. У пастанове ЦК гаворыцца: «Асноўным зместам работы партгабінетаў павінна быць: аказанне тэарытычнай і метадычнай дапамогі прапагандыстам і партактыву».

Партгабінеты яшчэ не арганізавалі належнай дапамогі прапагандыстам у іх рабоце. Для пацвярджэння гэтага можна прывесці хоць-бы такі факт, што для многіх прапагандыстаў, як і для прапагандыста **Кацнельсона** з завода «Ударнік», тэма аб 70-годдзі 1 Інтэрнацыянала з'явілася нечаканасцю. Аб ёй яны даведаліся толькі ў дзень заняткаў. І гэта тэма без папярэдняй падрыхтоўкі прапагандыста была прапрацавана павярхоўна і падчас бытавана.

Рад прапагандыстаў прыступілі да заняткаў, не ведаючы ўмоў работы слухачоў, задач праціўрымства. Партгабінеты абавязаны зараз-жа арганізаваць наглядныя дапаможнікі для ўвязкі работы школ з практычным жыццём прад прыемства. На работу ў партгабінеты неабходна вылучыць тэарытычна падрыхтаваных таварышоў.

Не гледзячы на тое, што заняткі гарадской партсеткі пачаліся з 15 верасня, да гэтага часу рад школ і гурткоў нават менскага дома партактыва не ўкамплектаваны. Кожны дзэ на заняткі прыходзяць новыя слухачы. Партыйныя камітэты, вылучыўшы комуністаў для заняткаў у гэтыя гурткі, не праверылі, як яны наведваюць іх. А як комуніст наведвае школу—абавязан правяраць партыйны камітэт.

У сістэму партыйнай асветы неабходна ўкараніць метады соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Парткомы абавязаны ведаць і рэагаваць на кожны факт пропуску заняткаў комуністам.

А куды варта такое камплектаванне школ, як на гомельскім эльводзе. Тут з арганізаванай соўпартшколы пасля некалькіх заняткаў пачалі вербаваць слухачоў у марксісцка-ленінскі гурток. Пры клад механічнага падыходу да камплектавання школ, вядзенне ўзроўню палітычнай падрыхтоўкі комуністаў поўнасцю паказаў парткам гомельскага эльвода.

Пастанова ЦК КП(б)Б абавязвае партарганізацыі «правесці камплектаванне сеткі партасветы на аснове ўліку вытворчых умоў і дакладнага вывучэння ўзроўню агульнай граматнасці і палітычнай падрыхтоўкі кожнага комуніста». Нельга камплектаваць сетку партыйнай асветы так, як на гомельскай электрастанцыі.

Недахопы работы гарадскіх школ, якія выявіліся ў першыя дні заняткаў, неабходна ўлічыць з тым, каб не дапускаць паўтарэння іх у рабоце вясковай партыйнай сеткі і на-ходу іх ліквідаваць.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове падкрэслівае, што «работа па марксісцка-ленінскаму выхаванню радоў партыі з'яўляецца справай усёй партыі і кожнай партарганізацыі ў паасобку. **Персанальна нясуць адказнасць за гэту работу сакратары гаркомаў, райкомаў, парткомаў і парторгі».**

Таму штодзённае аператыўнае кіраўніцтва справай марксісцка-ленінскага выхавання з боку партыйных камітэтаў дасць магчымасць паспяхова выканаць дырэктывы ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б, забяспечыць своечасовы нармальны ход заняткаў на высокім ідэйна-палітычным узроўні ўсяго навучальнага года.

У СОВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР І ЦК ВКП(б)

СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову аб ходзе работ па рамонту і ліквідацыі запушчанасці пуцявой гаспадаркі чыгунак.

У гэтай пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) адзначаюць, што, не гледзячы на больш высокае разгортванне ў 1934 годзе пуцявых работ і вялікую ўвагу ў НКШЗ і на дарогах да пуцявой гаспадаркі, тэмпы і асабліва якасць работ па рамонту і прывядзенню ў парадак пуцявой гаспадаркі па сетцы чыгунак усё яшчэ нездавальняючыя.

Асабліва дрэнна выконваюць праграму па рамонту пуці, па якасных і колькасных паказальніках наступныя чыгункі: Сярэдне-Азіяцкая (нач. т. Пракоф'еў), Омская (нач. т. Базулін), Самара-Златаустаўская (нач. т. Кавылкін), Окцябрская (нач. т. Сінеў) і Усходне-Сібірская (нач. т. Голышэў).

Праграма работ па рэканструкцыі пуці (укладка шчабёначнага баласта, дабаўленне шпал, устаноўка новага тыпу скрапленняў) на радзе важнейшых дарог аказалася сарванай (Паўночная, Маскоўска-Курская, Маскоўска-Казанская чыгункі).

СНК СССР і ЦК ВКП(б) устанавілі, што адной з прычын недобраякаснасці і адставання пуцявых работ з'яўляюцца запозненая падрыхтоўка як Упраўлення пуці НКШЗ, так і начальнікаў чыгунак да своечасовага разгортвання работ па рамонту пуці і дрэнная ўкамплектаванасць прасцейшымі прыборамі механізацыі. Разам з тым СНК СССР і ЦК ВКП(б) адзначаюць таксама невыкананне Наркамцяжпромам праграм пастаўкі Наркамату шляхоў сносін балтоў і кастылей і недапастаўкі Наркамлесам шпал, маставых і пераводных брусоў.

Лічачы недапушчальным у далейшым адставанне работ па рамонту пуці СНК СССР і ЦК ВКП(б) абавязалі НКШЗ і начальнікаў дарог поўнасцю выканаць план рамонту пуці да 1 лістапада.

Начальнікі дыстанцый абавязаны асабіста праводзіць прыёмку адрамантаванага як калонамі, так і брыгадамі пуці.

Начальнікі дарог павінны асабіста правяраць работу інжынерна-тэхнічнага складу, рамонтных калон.

Пастаянны кантынгент пуцявых рабочых павялічан са 100 тысяч да 150 тысяч чалавек.

Адначасова СНК СССР і ЦК ВКП(б) указалі на неабходнасць паляпшэння снабжэння пуцявых рабочых і садзейнасці ім у развіцці індывідуальнай гаспадаркі (жывёлагадоўля, агародніцтва і т. д.).

СНК СССР і ЦК ВКП(б) прапанавалі перабудаваць сістэму аплаты працы пуцявых рабочых, інжынерна-тэхнічнага персанала такім чынам, каб была забяспечана зацікаўленасць у якасці праводзімай работы не толькі брыгады, але і кожнага рабочага, у прыватнасці, прапанавана ўвесці прэміраванне за высокую якасць работ і паніжэнне аплаты за недобраякасна адрамантаваныя ўчасткі.

Для падняцця кваліфікацыі сярэдняга камандняга складу пуці прапанавана прапусціць праз курсы павышэння кваліфікацыі на працягу зімовага перыяда 1934-1935 г. не менш 50 проц. складу дарожных і маставых майстраў і брыгадзіраў пуці.

НКШЗ прапанавана забяспечыць давядзенне плана пуцявых работ на 1935 г. і план арганізацыі ўкамплектавання механізмамі пуцявых калон да дыстанцый пуці не пазней 1 студзеня 1935 г.

Побач з гэтым СНК СССР і ЦК ВКП(б) прапанавалі Наркамцяжпрому і Наркамлесу забяспечыць поўнае выкананне заданай ім праграмы пастаўкі пуцявых матэрыялаў (рэйкавых скрапленняў, шпал, прапітачных матэрыялаў і т. д.).

Палітупраўленню НКШЗ прапанавана распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ўмацаванню партыйных арганізацый пуці.

Пастанова ЦК ВКП(б)

АБ НОВАЧЭРКАСКІМ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫМ ІНСТЫТУЦЕ

ЦК ВКП(б) канстатуе, што ў рэзультаце прынятых за апошнія два гады Цэнтральным Камітэтам партыі мер па паляпшэнню работы ВТНУ і ВНУ (рашэнні аб школе, аб стыпендыях, інтэрнатах, аб грамадскіх нагрузках, аб павышэнні ролі і аўтарытэта дырэктароў і інш.) дасягнут рад поспехаў у пастаноўцы навучання, ва ўмацаванні вучэбнай дысцыпліны і ў паляпшэнні матэрыяльна-бытавога становішча і культурна-палітычнага абслугоўвання вучняў.

ЦК адзначае разам з тым, што за апошні час некаторыя мясцовыя партыйныя арганізацыі прыкметна аслабілі сваю ўвагу да пытанняў быту і жыцця студэнцтва.

Гэта асабліва наглядна выявілася пры абследванні Новачэркаскага індустрыяльнага інстытута, праведзеным Прамысловым аддзелам ЦК ВКП(б) і ўпаўнаважаным КПК па Азова-Чорнаморскому краю.

У Новачэркаскім індустрыяльным інстытуце адсутнічаюць элементарныя клопаты аб патрэбах студэнтаў. Інтэрнаты знаходзяцца ў ВЫКЛЮЧНА АГІДНЫМ СТАНОВІШЧЫ, НЕ АДРАМАНТАВАНЫ, НЕ АБСТАЛЯВАНЫ, РАЗБІТЫЯ ШЫБЫ МЕСЯЦАМІ НЕ ЎСТАЎЛЯЮЦЦА, НЯМА ЎМЫВАЛЬНІКАЎ, няма мінімальных элементарных выгад для работы і адпачынку студэнтаў.

Масавая выхаваўчая работа сярод студэнтаў не арганізавана. Ні ў адным інтэрнаце, як і ў самым інстытуце, няма бібліятэкі мастацкай літаратуры. У інстытуце, дзе навучаецца звыш 2.000 студэнтаў, нічога не робіцца, каб па-культурнаму арганізаваць досуг навучаючыхся, каб арганізаваць спорт.

У рэзультаце гэтага сярод асобных студэнтаў з'явіліся хваравітыя з'явішчы (п'янства, бытавое разлажэнне і т. д.).

ЦК ВКП(б) лічыць, што такое становішча ў Інстытуце стварылася таму, што дырэктар інстытута тав. Паршыкаў не зразумеў адказнасці і складанасці выхавання студэнцкай моладзі. Тав. Паршыкаў не цікавіўся бытам студэнтаў, не правяраў становішча інтэрнатаў, фармальна адносіўся да законных скаргаў студэнтаў, пазбаўляў студэнтаў стыпендый, не ўваходзячы ў прычыны адставання іх у вучобе. Тав. Паршыкаў не стварыў у інстытуце такой абстаноўкі, пры якой кожны студэнт мог-бы прыйсці да яго за вырашэннем балючых пытанняў сваёй вучобы і жыцця.

Толькі пры бюракратычным кіраўніцтве інстытутам магні мець месца такія абураючыя выпадкі, калі нам. дырэктара па адміністратыўна-гаспадарчай частцы Валовік выганяў са свайго кабінета студэнтаў, якія зварачаліся да яго па сваіх бытавых пытаннях.

ЦК ВКП(б) асобна падкрэслівае, што ўсе гэтыя агіднасці прайшлі міма кіраўніцтва партыйнай арганізацыі інстытута, а сакратар парткома тав. Грэчко не здолеў арганізаваць штодзённую большэвіцкую партыйна-масавую работу сярод студэнцтва і не вёў ніякай барацьбы з фактамі начулых і бяздушных адносін да патрэб студэнтаў.

Прамыслова-транспартны аддзел Азова-Чорнаморскага крайкома ВКП(б) (тав. Рабакоў) і Новачэркаскі райком (тав. Лашэнка) праявілі развал партыйна-масавай работы ў інстытуце, не праявілі становішча матэрыяльна-бытавога і культурна-палітычнага абслугоўвання студэнтаў і накіроўвалі на кіруючую работу ў інстытут нягодных і выпадковых людзей (Валовік, Рулеў).

Начальнік галоўнага кіраўніцтва навучальнымі ўстановамі Наркамцяжпрома тав. Петроўскі правёў фармальнае аб'яднанне раду інстытутаў у Новачэркаскі індустрыяльны інстытут, не забяспечыў Інстытут кваліфікаванымі кіруючымі кадрамі, не падрыхтаваў неабходнай матэрыяльнай базы і не ажыццяўляў штодзённага кіраўніцтва адной з буйнейшых навучальных устаноў НКЦП.

ЦК ВКП(б) ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. За бяздушныя адносіны да штодзённых патрэб студэнтаў і адсутнасць усякага кантролю над работай сваіх абюракратыўшыхся і разпажыўшыхся памочнікаў зняць з работы дырэктара інстытута тав. Паршыкава.

2. За няўменне арганізаваць барацьбу з хваравітымі з'явішчамі сярод студэнцтва і за адсутнасць масавай выхаваўчай работы ў інстытуце зняць з работы сакратара парткома тав. Грэчко.

3. Выключаных з партыі Валовіка (нам. дырэктара па гаспадарчай частцы) і Рулева (кіраўніка інтэрнатаў) за развал гаспадаркі інстытута і агіднае становішча інтэрнатаў аддаць пад суд.

4. Прапанаваць Наркамцяжпрому неадкладна прыступіць да рамонту і абсталявання інтэрнатаў інстытута, падрыхтаваўшы іх к зіме.

5. Абавязаць Азова-Чорнаморскі крайком ВКП(б) умацаваць кіраўніцтва партыйнай арганізацыяй і комсамолам інстытута.

6. Камандзіраваць нач. ГУУЗ'а НКЦП тав. Петроўскага ў Новачэркаск для прыняцця на месцы неабходных мер па забеспячэнню нармальнага разгортвання навучальнага года.

ЦК ВКП(б) звяртае ўвагу крайкомаў, абкомаў і ЦК нацкомпартый, што ўскрытыя ў Новачэркаскім індустрыяльным інстытуце хваравітыя з'явішчы маюць месца таксама і ў другіх інстытутах (Сталінградскім механічным, Вятскім зоаветэрынарным, Одаскім сельскагаспадарчым і інш.).

ЦК ВКП(б) ставіць перад крайкомамі, абкомамі і ЦК нацкомпартый, у першую чаргу перад прамыслова-транспартнымі, сельскагаспадарчымі і культпропаддзеламі задачу рашучага ўзмацнення ўвагі да пытанняў матэрыяльнага і культурна-палітычнага абслугоўвання студэнцтва, умацавання вучэбнай дысцыпліны, падбору кіруючых кадраў і сістэматычнай праверкі іх работы, забяспечваючы павышэнне ролі і аўтарытэта дырэктароў навучальных устаноў.

За большэвіцкую праверку выканання рашэнняў ЦК ВКП(б) і КП(б)Б аб жывёлагадоўлі

А. КАРТУКОЎ

загадчык сельгасаддзела ЦК КП(б)Б

⊙ ⊙ ⊙

25 кастрычніка ў Менску збіраецца ўсебеларуская нарада па пытаннях развіцця калгаснай жывёлагадоўлі ў БССР. Наўрад ці трэба гаварыць аб тым, наколькі гэта нарада важная і неадкладная. Дастаткова сказаць, што ЦК асноўнай задачай нарады ставіць праверку выканання намечаных партыяй і ўрадам мерапрыемстваў па калгаснай жывёлагадоўлі.

Гэта значыць, што прыдзецца добра праверыць, як мы здолелі перабудаваць практыку сваёй работы ў галіне жывёлагадоўлі ў адпаведнасці з пастановамі пленума ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і праверыць яе на выключна важным участку — гэта падрыхтоўкі і правядзення зімоўкі.

Не так даўно на прыкладзе ферм калгасаў **«Комінтэрн», Магілеўскага і Дзяржынскага** раёнаў ЦК звяртаў увагу партыйных і совецкіх арганізацый на тое, што пастановы пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б не знаходзяць пакуль яшчэ належнага адбітку ў кіраўніцтве работай калгасных ферм.

Нельга сказаць, каб гэта палажэнне было зразумета ва ўсіх раёнах, як сігнал да неадкладнага паляпшэння і ўзмацнення работы па разгортванню калгаснай жывёлагадоўлі, і асабліва ў падрыхтоўцы да зімы.

У цэлым радзе раёнаў у райсаўкіраўніцтвах калгасаў, ды і ў саміх РВК і райкомах, зусім не адчуваюць набліжэння зімы.

Возьмем **Старадарожскі і Расонскі** раёны. Тут план сіласавання выканалі ўсяго напалову, а раённае кіраўніцтва і ў вус не дзме, пякай трывогі. Возьмем **Клімавіцкі** раён. Каму-каму, а гэтаму раёну трэба было-б зрабіць для сябе мацнейшыя вывады з мінулай зімы, а ён і ў гэту зіму ўступае, выканаўшы план па сіласаванню толькі на 66 проц.

Уся бяда ў тым, што многія нашы аказныя, ды і кіруючыя работнікі на месцах разглядаюць справу жывёлагадоўлі не як штодзённую, абавязковую, адказную частку сваёй работы, патрабуючай галізарнай увагі і канкрэтнага кіраўніцтва, а як чарговую кампанію. А з прычыны таго, што зараз хлебазакупкі, копка і возка бульбы, ільназагатоўкі — то можна, моў з жывёлагадоўляй пачакаць, — зімой часу больш будзе, а пакуль пяхай райза павозіцца.

А раз у райза не адна гэта справа, ды яшчэ яму другія заданні неадкладныя даюць, то часценька жывёлагадоўляй па сутнасці справы ніхто не кіруе.

Могуць запярэчыць, што так было да пленума ЦК ВКП(б), а цяпер, моў, інакш. Вядома, пасля пленума многія раёны па-большэвіцку ўзяліся за справу жывёлагадоўлі, рад калгасных ферм далі дасканалыя ўзоры работы, арганізаваліся новыя фермы; па ініцыятыве аршанскіх калгаснікаў пачат жывёлагадоўчы паход імя VII з'езда совецтаў. Аднак, знайшліся і такія, якія абмежаваліся траскатнёй аб жывёлагадоўлі, практычна не ператвараючы ў жыццё ўказанняў партыі і ўрада.

Усеболаруская нарада, у якой будуць прымаць удзел лепшыя з лепшых, павінна выцягнуць на свет усе гэтыя недахопы, разабраць іх па косткачах і ў той-жа час паказаць на прыкладзе лепшых калгасных ферм як трэба працаваць, каб па-большэвіцку выконваць пастаўленыя партыяй задачы ў галіне жывёлагадоўлі.

Калгасная жывёлагадоўля ў БССР вырасла за апошні час да значных размераў. У нас 11.134 жывёлагадоўчых калгасных ферм. У іх да 423.000 галоў буйнай рагатай жывёлы, звыш 200.000 свінога пагалоўя і 83 з лішнім тысячы авечак.

Гэта значыць, гаспадарка настолькі буйная, што яе далейшае ўмацаванне і развіццё патрабуе сур'ёзных мер і канкрэтнага аператыўнага кіраўніцтва. Такія пытанні як арганізацыя працы на фермах, увядзенне здзельшчыны, заахвочванне за пераработку і лепшыя паказальнікі, матэрыяльная адказнасць за пасаванне і дрэнную работу; племянная справа з шырокім маштабам метызацыі, масавай гадоўлі племяннога маладняка і яго ўліку; расшырэнне кармовай базы і арганізацыя кармлення; пастаноўка ветэрынарнай і зоатэхнічнай справы — павінны стаць на ўвесь рост. У той-жа час нельга сказаць, каб з боку нашых навукова - даследчых арганізацый і спецыялістаў гэтыя пытанні атрымалі колькі-небудзь сур'ёзную распрацоўку. Ва ўсякім выпадку, да гэтага часу ні па аднаму з указаных пытанняў няма папулярна выданай работы.

Трэба, каб да нарады і на самой нарадзе асобныя пытанні жывёлагадоўлі (арганізацыя працы, племянная справа, корм, ветэрынарна-зоатэхнічная работа і т. д.) атрымалі шырокае асвятленне з вуснаў спецыялістаў і навуковых работнікаў сельскай гаспадаркі.

Міркуецца, што ў нарадзе прымуць удзел лепшыя фермы, лепшыя іх кіраўнікі, работнікі, спецыялісты. У нас часта на тую ці іншую нараду падбіраюцца людзі за дзень, за два да адкрыцця нарады. І тут бывае не да выбару, — хто лепш, а хапай, хто пад руку папаўся. На прадстаячую нараду па жывёлагадоўлі райвыканкомы абавязваюцца зацвярджаць кандыдатуры на нараду пастановай прэзідыума. Гэта значна ўзмацняе адказнасць за падбор кандыдатаў і прымусіць ужо зараз у раёне добра праверыць работу ферм, спецыялістаў, калгаснікаў.

Няма чаго і гаварыць, што друк як цэнтральны, так і раённы павінен адыграць велізарную ролю ва ўсёй падрыхтоўцы нарады. Умела зваставіць увагу раённых партыйных і совецкіх арганізацый калгасаў, калгаснікаў на задачах нарады, на тым, што права ўдзелу ў ёй заваёўваецца добрай работай і лепшымі паказальнікамі на ферме. Патрэбна забяспечыць у значнай меры сапраўды дзелавы падбор складу нарады.

Па-баявому разгорнем пачаты калгасамі БССР жывёлагадоўчы паход імя VII з'езда совецтаў.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць райвыканкомам і советам неадкладна арганізаваць, у адпаведнасці з арт. 3, 4, 5, 6, 8 і 9 Інструкцыі аб выбарах у советы БССР (З. З. БССР за 1930 год № 42, паст. 275), раённыя, гарадскія, сельскія і местачковыя выбарчыя камісіі.

2. Назначыць старшынямі раённых выбарчых камісій старшынь раённых выканаўчых камітэтаў.

3. Назначыць старшынёй менскай гарадской выбарчай камісіі т. **Жуковіча**, віцебскай — тав. **Аверына** і гомельскай — тав. **Малашонка.**

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

3 кастрычніка 1934 г.
г. Менск.

„ЖАБРАКІ НАВАДНІЛІ ВЁСКІ Ў ПОЛЬШЧЫ"

ВАРШАВА. Галоўны орган украінскай буржуазіі на Заходняй Украіне ўнадаўская газета **«Діло»** змяшчае пад загалоўкам «Жабракі навеснілі нашы вёскі» артыкул аб росце жабрацтва ў Польшчы. «Тое, што адбываецца сёння ў вёсцы, але аб чым адкрыта не гавораць, — піша газета, — гэта настолькі нервуе і раздражае, што становіцца страшна, да якіх усё гэта можа прывесці вынікаў. Няма ніводнай вёскі, няма хаты, няма ні дня ні ночы, калі можна было-б абыйсціся без жабракоў».

Газета піша, што многія з іх знаходзяцца «на дне галечы». Такое становішча не толькі ў вёсках, але і ў гарадах, «дзе званок ля дзвярэй ні на хвіліну не спыняецца». Колькасць жабракоў у вёсках, як і ў гарадах Польшчы, расце з кожным днём. Цэлая іх армія вандруе ад вёскі да вёскі: людзі з **Лодзі, Варшавы,** гарадоў **Памор'я,** — літаральна з усёй Польшчы. «У такіх умовах, — піша газета, — вёска зусім не ведае, што прадпрыняць».

Газета заканчвае даволі яснай прапановай — адпраўляць беспрацоўных, вымушаных жабраваць, у прымусовым парадку на «грамадскія работы». «Як абараняцца ад гэтага нашэсця жабракоў? — гаворыць газета. Лепш за ўсё робіць Варшава. Яна вылоўлівае на вуліцах усіх жабруючых і адпраўляе іх на грамадскія работы». (ТАСС).

РОСТ БЮДЖЭТНАГА ДЭФІЦЫТУ

ВАРШАВА. **«Газета Варшавска»** змяшчае цікавыя даныя аб выкананні дзяржаўнага бюджэта Польшчы за першыя пяць месяцаў бягучага года. Гэтыя даныя цікавы тым, што яны грунтоўна абвяргаюць цверджанне афіцыяльнай статыстыкі аб «добрым становішчы дзяржаўнага бюджэта Польшчы». Гаспадарчы аглядчык «Газеты Варшавскай» канстатуе, што даходы дзяржавы, ва ўласным сэнсе слова, за першыя пяць месяцаў бягучага года склалі 723,4 млн. злотых. Ламіма гэтага, у афіцыяльных справаздачах у артыкуле «дзяржаўныя даходы» фігуруе таксама сума ў 134,5 млн. злотых, атрыманая шляхам унутранай пазыкі.

У 1934-35 бюджэтным годзе дэфіцыт за пяць месяцаў па дзяржбюджэту ўзрос параўнальна з тымжа перыядам мінулага года на 19,2 млн. злотых.

Паведамляючая гэтыя артыкулы «Газета Варшавска» бярэ пад сумненне афіцыяльную версію аб «роўнавазе дзяржаўнага бюджэту Польшчы». «Становішча з бюджэтам, — канстатуе газета, — не палепшылася, а пагоршылася, бо дэфіцыт бюджэта ўзрастае. Цяжка прадбачыць, якія даходы і расходы будуць праведзены да канца бюджэтнага года, бо наперадзе яшчэ амаль сем месяцаў. Аднак, з даных, якія мы маем за першыя пяць месяцаў бюджэтнага года, можна меркаваць, што дэфіцыт бягучага бюджэтнага года дасягне 320 млн. злотых з лішкам. Цяжка назваць такое становішча рэчаў добрым». (ТАСС).

ЛІХВЯРСТВА Ў ГАСПАДАРЧЫМ ЖЫЦЦІ

ВАРШАВА. **«Газета Варшавска»** змяшчае артыкул аб пашырэнні ліхвярства ў дзяржаўным жыцці Польшчы. Паводле даных, якія ёсць у гэтым артыкуле, нядаўна праведзенае банкам польскім зніжэнне ўчотнага процанта да 5 проц. дало надзвычай мала рэзультатаў, бо большасць дробных шукальнікаў крэдытаў пазбаўлены магчымасці карыстацца крэдытамі банка польскага. У сярэднім каля 80 проц. звяртаючыхся за крэдытамі к банку польскаму астаюцца незадаволенымі банкам. Таму прамыслоўца або гандляр, кажа газета, вымушан прыбягаць к крэдытнай дапамозе з боку дробных банкаў. Апошнія-ж адпускаюць свае пазыкі пад надзвычай высокія процанты.

Газета ўказвае яшчэ на адзін від кабальнага крэдыта. Гэты від крэдыта носіць назву «замежны крэдыт» і асабліва пашыран у лясной гаспадарцы Польшчы. Гэты крэдыт звычайна аказваюць агенты чужаземных гандлёвых фірм. Яны фінансуюць закупку сыравіны, бесперабойную работу лесазаводаў, аплату рабочай сілы і т. п. За ўсё гэта «замежны крэдытор» атрымлівае неабходны яму польскі тавар па цэнах значна ніжэй рыначных, што аўтаматычна прыводзіць да ўсеагульнага зніжэння цэн на польскія тавары на замежных рынках. (ТАСС).

ЭМІГРАЦЫЯ З ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА. У «Газеце Варшавскай» змешчан артыкул аб эміграцыі з Польшчы і ўплыве яе на рынак працы ўнутры краіны. Газета адзначае апрамаднае значэнне «вечна актуальнага для Польшчы пытання аб эміграцыі, якое заўсёды было адушэўнай для насычанага лішкавай рабочай сілай унутрыпольскага рынка працы». Газета прама піша, што дзякуючы эміграцыі соцень тысяч чалавек з Подышчы, Польшча ўнікнула «катастрофы, якую нясе беспрацоўе».

Газета прыводзіць рад цікавых даных аб руху гэтай эміграцыі за апошнія гады. З гэтых даных выцякае, што на працягу гадоў крызіса ў галіне эміграцыі рабочай сілы з Польшчы наступіў характэрны пералом. Так, калі ў дакрызісныя гады і ў пачатковай стадыі крызіса (1928-1930 г.) з Польшчы за граніцу эмігравала ў сярэднім 23 проц. натуральнага прыросту Польшчы, то ўжо ў 1931 г. пачынаецца прыліў рээмігрантаў г. зн. тых, што вярочаюцца назад у Польшчу з-за граніцы. У 1931 г. лік рээмігрантаў перавысіў лік эміграваўшых з Польшчы на 11700 чал., у наступным-жа годзе гэта лічба дасягнула 17.100 чал. Калі за апошнія паўтара года ў гэтай галіне і наступіла некаторае паляпшэнне, то ўсё-ж лік рээмігрантаў астаецца ўсё яшчэ даволі высокім. Так, за першыя 7 месяцаў бягучага года з Польшчы эміграваала 19.631 чал, назад-жа ў Польшчу вярнулася 12.103 чал. (ТАСС).

НА ТЭМЫ ДНЯ

ДАЙЦЕ ДАШКОЛЬНІКУ КНІЖКУ З МАЛЮНКАМІ

На вокладцы кніжкі значыцца: «Здана ў друкарню 25-III-34 г. Падпісана да друку 15-IV-34 г.» Але не вер ачам сваім, дарагі чытач! Кніжка ў вытворчасць здана была два гады назад—у 1932 годзе. Мае яна ўсяго чатырнаццаць старонак; чытач, на якога яна разлічана вырас ва гэтыя два гады, наведвае першы або другі клас сярэдняй школы і чытаць гэту кніжку ўжо не хоча.

Праўда, яна магла-б падыйсці яго малодшаму брату або сястры—дашкольнікам. Гучныя рытмічныя вершы майстра мастацкага слова для дзяцей—пісьменніка Маршака, удалы пераклад на беларускую мову робяць гэты твор «Вайна з Дняпром» вельмі карысным дапаможнікам у выхаванні дашкольнай дзетвары. Але кніжку, якая рабілася ДВВ на працягу двух год, раіць бацькам і дзіцячым садам нельга. Нават даросламу, які прызвычаіўся да розных фармалістскіх выкрутасаў мастакоў, цяжка зразумець, што нарысавана на малюнках **А. Заборава.** Папера кніжкі нейкая жаўтавата-шэрая, малюнкі афарбаваны ў брудна-блакітны колер. І ўсё гэта разам узятае каштуе... 1 рубель.

Адкінем гэту кніжку, як неадпавядаючую патрабаванням, што прад'яўляюцца да кніжкі для дзяцей дашкольнага ўзросту. Прагледзім другую—«Як Паўлік правёў 1 мая».

Вершы **Зак і Качкачовай** таксама добрыя, гучныя, рытмічныя. Змест іх будуецца на зразумелым дзіцяці, бачаным у акружаючым жыцці, матэрыяле без «лівацкай» пацяжкі «тлыбокай палітыкі» і «элементаў крамадазнаўства». Пераклад Зімёнкі—вельмі ўдалы. Малюнкі **А. Воўкава** рэалістычныя і чоткія (вось толькі аўтамабіль не ў меру выцягнут у даўжыню). Але папрабуйце даць дзіцяці па гэтых малюнках уяўленне аб колеры, апрача чырвонага, ні аднаго чыстага яснага колеру! Папера, як і ў першай кніжцы, шэрая. Цана... 1 р. 25 кап.

Так выдаюць у нас кніжкі для дашкольнікаў. Можа мы прывялі толькі найменш удалыя ўзоры? Не! Гэта ЎСЁ, што выдана для малышоў Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі за апошнія два гады. Дзве кніжкі—і ўсё.

Менская друкарня імя Сталіна, якая так нядбайна і неахайна надрукавала гэтыя дзве кніжкі, трымае ў сябе на працягу больш года сем кніжак для дашкольнікаў. Адна кніжка — «Пра Бобу і мікробу» ляжыць у друкарні з 1932 года. 4 кніжкі (Якімовіча «Сэрца горада», Ляшэвіча «Лягчэй за паветра», Дылы «Агарод» і Маўра «Совецкая кватэра») праваляліся ў друкарні з 1931 года, пакуль не забраны выдавецтвам назад. Кніжкі Якімовіча «Окцябраты» і Дылы «Заблудзіўся» вусім невядома куды зніклі, загінулі.

Гомельская друкарня «Палеодрук» наогул адмовілася нават прымаць рукапісы дзіцячых кніжак—няма ахвоты вазіцца з гэтай патрабуючай любві і клапатлівасці работай.

Так цэлае пакаленне малышоў астаецца ў нас без кніжкі, без малюнка.

Гэта прарыў велізарнейшы. Мімо яго не можа прайсці ніхто. Трэба літаральна біць трывогу. Тэксты — і арыгінальныя і перакладныя—мы маем. Патрэбны безадкладныя меры, якія-б прымусілі тав. Бадынермана з Паліграфтраста, т. Цёмкіна з друкарні імя Сталіна, т. Лейбіна з Палеадруку, т. Бройдо з Паперабыта забяспечыць выпуск дзесяткаў кніжак для дашкольнікаў самым ударным парадкам пры найвышэйшай якасці іх тэхнічнага афармлення.

ПА ПРЫКЛАДУ НЕМАЙЦЯНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА УСЕ КАЛГАСЫ І СЕЛЬСОВЕТЫ БССР МОГУЦЬ І ПАВІННЫ ВЫКАНАЦЬ У КАСТРЫЧНІКУ ПЛАН ІЛЬНАЗАГАТОВАК

ПЕРАМОГА НЕМАЙЦЯНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА

Перамога НЕМАЙЦЯНСКАГА сельсовета (Сенненшчына) сведчыць аб тым паваротце, які адбыўся за апошні час у свядомасці мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў у адносінах каштоўнейшай для БССР тэхнічнай культуры—ільну.

Калгаснік КАЦАР ФЁДАР з калгаса імя Тімірязева, Сенненскага раёна, атрымаў у гэтым годзе 25 пудоў хлеба толькі на ільняныя працадні. Калгасы Немайцянскага сельсовета на справе даказалі, што варта толькі па-гаспадарску адносіцца да апрацоўкі ільну, варта аўладаць тэхнікай гэтай справы, устанавіць за ільном пільны нагляд, як заможнае жыццё для калгаснікаў забяспечана.

Ушчэнт разбіты кулацкія разважанні аб невыгоднасці ільну для калгасаў.

Сіла перамогі Немайцянскага сельсовета заключаецца яшчэ ў тым, што ён здолеў спалучыць з барацьбой за лён і ўсе іншыя петня-асенція сельска-гаспадарчыя кампаніі, дабіўся перамогі на ўсіх асноўных участках сельскай гаспадаркі.

Прыклад Немайцянскага сельсовета паказвае, што ўсе калгасы і сельсоветы БССР маюць магчымасць на працягу кастрычніка поўнасцю закончыць пераапрацоўку і здачу высокаякаснага ільну дзяржаве. Для гэтага патрабуецца толькі адно—здолець правільна расставіць сілы ў калгасах, перакінуць на пераапрацоўку ільну асноўную масу калгаснікаў, зразумець, што своечасовая, высокаякасная пераапрацоўка і здача ільну дзяржаве з'яўляецца першачарговай задачай дзяржаўнага значэння.

УКЛЮЧЫЦЦА Ў ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ VII З'ЕЗДА СОВЕТАЎ, СУСТРЭЦЬ ОКЦЯБРСКУЮ ГАДАВІНУ ПОЎНЫМ ЗАВЯРШЭННЕМ ПЕРААПРАЦОЎКІ І ЗДАЧЫ ІЛЬНУ ДЗЯРЖАВЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА СПРАВАЙ ГОНАРУ, БАЯВЫМ АБАВЯЗКАМ КОЖНАГА КАЛГАСА І СЕЛЬСОВЕТА БЕЛАРУСІ.

ЯК МЫ ДАБІЛІСЯ ПЯРШЫНСТВА

1 кастрычніка, роўна на тры месяцы раней чым у мінулым годзе, калгасы і аднаасобнікі Немайцянскага сельсовета, Сенненскага раёна першымі скончылі ільназагатоўкі, здаўшы дзяржаве 1.817 цэнтн. трасты і 271 цэнтн. валакна. Якасць зданай прадукцыі намнога вышэй, чым вызначалася ў кантрактацыйных дагаворах, траста замест ся рэдняга 1,57 нумара здана 2,5 нумарам, валакно замест 9 нумара здана 11,8 нумарам.

Гэтыя поспехі намі дасягнуты, дзякуючы своечасоваму і дакладнаму выкананню ўсіх агратэхнічных мерапрыемстваў, звязаных з апрацоўкай ільну.

Мы добра правялі раннюю і звышраннюю сяўбу ільну. Трайная праполка перад цераблеццем таксама дала свае вынікі. Лён урадзіў высокі і чысты. Цераблене як у калгасах, так і ў аднаасобных гаспадарках рабілася на тры гатункі. Выцераблены лён сартаваўся не толькі па даўжыні, але і па колеру.

Уся ўвага была накіравана на тое, каб выбраць добрае сцеліўча, своечасова разаслаць і падняць лён.

На заводы мы накіроўвалі трасту высокай якасці, прама са сцеліўча, арганізуючы пры гэтым стараннае сартаванне.

Ручную пераапрацоўку трасты пачалі адначасова амаль усе 17 калгасаў сельсовета, а за імі і аднаасобнікі. Мы імкнуліся скончыць апрацоўку ільну да масавай уборкі бульбы. На ільне спачатку працавала 75 проц. рабочай сілы.

Велізарную дапамогу нашым калгасам аказалі работнікі політадзела МТС. Яны дапамаглі нам сваім канкрэтным кіраўніцтвам перанесці ўсю масавую работу ў брыгаду, на ёўню, мяльна-трапальны пункт, арганізаваць круглясутачную работу, шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва не толькі паміж калгасамі, але і ўнутры калгасаў.

Уважлівы догляд за ільном даў свае вынікі. 300 пудоў жыта атрымаў калгас «Парэчча» для размеркавання па ільняных працадзнях. 270 пудоў атрымаў калгас імя Тімірязева. Гэта апрача алею, цукру, рыбы, махоркі, промтавараў.

Разам з калгасамі па-ўдарнаму вялі апрацоўку і здачу ільну і аднаасобнікі.

Па-большэвіцку арганізуючы ільназагатоўкі, мы адначасова не забывалі і пра іншыя работы. План сілазавання намі перавыкананы. 30 верасня поўнасцю выканан фінплан трэцяга квартала. Лепшым доказам таго, як мацнеюць нашы калгасы і становяцца заможнымі калгаснікі, з'яўляецца тое, што мы прадалі дзяржаве хлеба значна больш, чым мерквалі раней.

Але зроблена яшчэ не ўсё. Усе сілы мы зараз накіроўваем на падрыхтоўку жывёлы да зімы, на завяршэнне зяблева, выкананне плана мяса- і малакопастаўак і засыпку насенных і страхавых фондаў. Толькі паспяхова справіўшыся з гэтымі задачамі, мы станем сапраўды перадавым сельсоветам.

МАГЕРА РЫГОР
Старшыня Немайцянскага сельсовета, Сенненскага раёна.

Да ўсіх калгаснікаў і аднаасобнікаў Сенненшчыны і Совецкай Беларусі

З пісьма калгаснікаў і калгасніц Немайцянскага сельсовета, Сенненскага раёна

1 кастрычніка 1934 года наш Немайцянскі сельскі совет за тры месяцы раней мінулага года завяршыў выкананне гадавога плана ільназагатовак.

У сваім пісьме мы хочам, з вамі, калгаснікі і калгасніцы БССР, падзяліцца вопытам сваёй работы.

Мы ўвесь час лічылі, што пасеяць і ўбраць лён — гэта толькі палова справы. Асноўнае і фашаючае — своечасова разаслаць, наладзіць пільны догляд за сцеліўчамі, не дапусціць ні пералежкі, ні недалежкі трасты.

Каб пазбавіцца лішніх перавозак, накіроўвалі трасту для здачы на ільназавод прама са сцеліўча і не проста якой, а самай лепшай якасцю. Траста здавалася нумарамі 3,5,3,2,5,2, і 1,75.

Адначасова была арганізавана пераапрацоўка трасты на валакно па ўсіх калгасах, аднаасобных дварах. На ільне ў нас працавала да 75 проц., усіх жанчын, часткова працавалі і мужчыны.

З пераапрацоўкай трасты ўвесь цяжар арганізацыйнай і масавай работы быў перанесен у ёўню, сушню, сартавальны пункт. Штодзенна на вытворчых нарадах падводзілі вынікі работы, вывешваліся спісы, колькі хто вытрацаў і якім нумарам, прэміравалі за лепшыя паказальнікі. Шырока было разгорнута соцспаборніцтва, спаборнічалі не толькі калгасы, спаборнічалі і трапальшчыцы, сушыльшчыкі паміж сабою. Перадавікоў і адстаючых, ведалі ўсе. Чорная і чырвоная дошка, дошкі спаборніцтва штодзенна запаўняліся.

Сартаванне перад пасадкай у ёўню, арганізацыя ахалоджвання трасты пасля ёўні, адлежкі пасля мялкі і правільная арганізацыя працы на ільнатрапальных і сартавальных пунктах вырашыла поспех справы. Мы ліквідавалі абязлічку. Кожнаму давалася заданне і па яго выкананні мы бачылі, хто і як працуе.

Кожны калгаснік і калгасніца наперабой стараліся зарабіць ільняныя працадні. На прыкладзе мінулага года мы ўпэўніліся, што лён гэта золата, наш хлеб і самая выгодная культура. Кошт ільнянога працадня значна падняўся. У той час, калі ў мінулым годзе на ільняны працадзень апрача хлеба, прылічваючагася па атульнаму размеркаванню 0,5—1 кілограм, то ўжо ў гэтым годзе кошт ільнянога працадня ў калгасе імя Тімірязева узняўся да 2.100 грам. А 1,5—2 кілограмы хлеба на ільняны працадзень — гэта звычайнае з'явішча.

У нас так была арганізавана справа, што кожная трапальшчыца па меры выпрацоўкі валакна атрымлівала хлебны аванс мукой на ільняныя працадні.

Вялікую дапамогу нашы калгасы і мы, калгаснікі, атрымалі ў асобе політадзела МТС.

Вопыт нашай работы гаворыць, што магчымасці датэрміновага закончыць ільназагатоўкі ёсць у кожным калгасе, аднаасобнай вёсцы. Адставанне БССР і асабліва асобных раёнаў недапушчальна.

Таварышы калгаснікі і калгасніцы нашага раёна і ўсёй Беларусі! Мы прад'яўляем вам большэвіцкі рахунак і на наш рахунак чакаем большэвіцкага адказу сотнямі тон штодзённа здаваемага высокакаяснага валакна, датэрміновага выканання плана ільназагатовак.

Галоўнае зараз не зазнавацца дасягнутым і не супакойвацца. Мы штодзённа ўзмацняем нашу работу. Дабіваемся пярэшынства па ўсіх кампаніях, уключаемся ў спаборніцтва за права быць занесенымі на ўсесаюзную чырвоную дошку.

Адкаваны ў брыгадзе па ільну тав. ГАРАСЕНКО (брыгадзір Шчомелеў) прымае лён ад трапальшчыцы ШЧЫМЕЛЕВАЙ А. (Калгас імя Сталіна, Малясітнінскага сельсовета, Полацкага раёна).

Каля кулямёта.

ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ БССР

Снайпер Мазепа

Гэта не той Мазепа, якога неналі Пётр 1 за вусы трымаў. У нашага Мазепы яшчэ такія вусы, за якія і патрымацца ніяк нельга. Ды і не такі Мазепа чалавек, каб да гэтага дапусціцца.

У бай пад Палтавай ён, праўда, уцякеў не прымаў, нават імперыялістычнай вайны не памятае: калі яшчэ пачалася Мазепе было ўсяго тры гады.

Грамадзянскую вайну памятае: знаёмы дзядзька, але яго цяжка было пазнаць — так ён увесь збіты і скрываўлены, ледзь жывы, а яго ўсё б'юць шампаламі і прыкладамі гэтыя страшныя салдаты. Гэта былі белапальякі з корпуса Дзюбор-Мусніцкага. Было вельмі шкада дзядзькі і яшчэ больш — страшна. Са страху залез тады Мазепа за сцірту дошак і сядзеў там да самай ночы, пакуль бацька з маткай не знайшлі яго і не выцягнулі ледзь жывога.

Не гледзячы на ўсю сваю маладосць тав. Мазепа з'яўляецца адным са знатных людзей Н-скага стралковага палка. Праўда, глянуўшы на яго вы можаце і не здагадацца, што перад вамі знатны чалавек: з выгляду нічым асаблівым сярод іншых байцоў ён не вызначаецца. У гэты-ж вось момант вы нават зусім яго не заўважыце. Вы бачыце толькі зялёны кусцік з яловых лапак і ўзразы. Нікому і ў галаву не прыйдзе, што гэта — жывы Мазепа.

Але вось на адлегласці 200 метраў паказваецца з-за куста галава «ворага». Яна пасоўваецца справа налева. Адзін за адным гучаць тры стрэлы і тры кулі прасвідрываюць «вораскі лоб».

«Лоб» гэты пакуль што фанерны. «Смяртэльныя» раны ў ім адзначаюцца чырвоным алоўкам і ён яшчэ некалькі раз паслужыць на карысць баявой падгатоўкі снайпераў.

Як-жа магло здарыцца, што пераменіць Мазепа за чатыры месяцы стаў адным з лепшых снайпераў у палку? Справа ў тым, што тав. Мазепа прыйшоў у Чырвоную армію ўжо маючы мноцтва з тых якасцей, якія так патрэбны байцу Чырвонай арміі: дысцыплінаванасць, свядомыя і добрасумленныя адносіны да справы, акуратнасць, непарушнасць у дасягненні пастаўленай мэты. Гэтыя якасці выпрацоўваліся гады, калі тав. Мазепа з невялікай групай бедняты арганізаваў калгас, калі часамі недаядаў і недасыпаў за працай, каб умацаваць гэты калгас і не даць яму разваліцца, калі змагаўся з кулакамі, якія, узяўшы над свой уплыў найбольш несвядомых з беднаты, павялі супроць калгаса шалёную агітацыю. Будучы ў калгасе, тав. Мазепа загадваў калгасным млынам, кашэраваў тыўнай крамай, малочнай. Гэта паказвае, што тав. Мазепу, цвяць, як добрасумленнага працаўніка, і даверяюць яму адказную работу.

— А ты пачытай, ды ніце расскажы, — параіла жонка: — я і сама яшчэ ўсіх не прачытала.

Прыпоўшы ў арагію, Мазепа ўзяўся за важную вучобу так-жа добрасумленна, як добрасумленна працаваў у калгасе. Тыя каштоўныя якасці, якія ён набыў у калгасе, тут яшчэ больш выкрышталіза валіся і ён хутка стаў адным з перших па ўсіх відах баявой падрыхтоўкі.

Добрым снайперам Мазепа стаў не адразу — спачатку спрадаў дрэнна. І прыпалінца, здаецца, добра, і дыханне затоіць, і курок плаўна спусціць, а кучнасці ніякай, прабоіны па ўсёй мішэні параскіданы.

— Таварыш начальнік, дапаможце Мазепе раз стрэліць з гэтай вінтоўкі. Моха ён зразумее сваю памылку, — звярнуўся раз камандзір адзялення Кірыленка да начальніка снайперскай каманды Гусева.

Гэта была вінтоўка з аптычным прыцелам.

«Прыклаў я да плеча гэту вінтоўку, — кажа Мазепа, — зірнуў, а там мушка, як бервяно, прораз, як тыя вароты. Адразу відаць, прыгінуўся мушку ўзяў ці не. Прыцеліўся я, стрэліў і адразу дзесятку выбіў.

— Ну, будзеш страляць, — сказаў мне начальнік.

З таго часу я стаў страляць значна лепш. Я зразумеў, у чым была мая памылка: я не ўмеў браць правільнай мушкі. Цяпер усе снайперскія задачы выконваю не менш як на добра, а чацвёрты за ўсё выдатна».

Вось чаму, працуючы ў калгасе, ён не забудзецца пра баявую падрыхтоўку, як, знаходзячыся ў радах Чырвонай арміі, не забывацца пра калгас.

К. КРАПІВА

Д. Ю. КОНІК

Загадчык Аддзела Культуры і Прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б

ЗА ЛЕПШУЮ ПАСТАНОЎКУ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ВУЧОБЫ*)

Праведзеная пры культпропе ЦК КП(б)Б нарада загадчыкаў партгабінетамі і абследаванне іх работы выявіла, што яны вельмі часта або абмяжоўваюць сваю работу чыста бібліятэчнымі функцыямі, або выконваюць функцыі б. культпропаў. Пытаннямі-ж тэарытычнай метадычнай дапамогі прапагандыстам займаюцца вельмі мала. Такое становішча з'яўляецца безумоўна ненармальным. Рад партарганізацый не зразумелі, што іх асноўная задача — паставіць работу партгабінетаў такім чынам, «каб яны аказвалі адпаведную дапамогу партактыву, прапагандыстам і слухачам сеткі. Трэба не загружаць іх дробязямі, пабудаваць іх работу культурна, так, каб там былі кніжкі і каб кожны жадаючы мог туды прыйсці і атрымаць патрэбнае растлумачэнне» (Сталін).

Зараз у мэтах паляпшэння работы партгабінетаў мы прапусцілі 40 загадчыкаў партгабінетамі праз месячныя курсы пры ЦК і мабілізуем 25 чалавек з Менска ў раёны па работы ў якасці загадчыкаў партгабінетамі. Паляпшэнне матэрыяльнае становішча работнікаў гэтага ўчастка, які паляпшаецца, быць цэнтрам тэарытычнай і метадычнай дапамогі актыву і прапагандыстам.

У паспяховай рабоце школ партасветы агромаднае значэнне мае правільны падбор слухачоў.

У мінулым годзе партыйныя камітэты ў большасці арганізацый камплектаваннем школ не займаліся, перадаваралі гэту работу другарадным асобам. У результаце школы і гурткі партасветы ў радзе месц былі скамплектаваны механічна, без пільнай праверкі ўзроўню ведаў кожнага комуніста. Сетка партасветы была надзвычай перапоўнена беспартыйнымі, комуніст тут губляўся, це быў у цэнтры ўвагі.

У гэтым годзе мы ўлічылі гэтыя памылкі, і зараз работа па камплектаванню сеткі партасветы праходзіць больш арганізавана, і больш сур'ёзна.

Праведзеная праверка паказала, што ў радзе арганізацый камплектаванне сеткі партасветы суправаджаецца вялікай масавай работай. Гэтыя пытанні дакладна абмяркоўваюцца на парткомах, на сходах пярвічных партарганізацый і праводзяцца гутаркі з асобнымі комуністамі. Значная частка партыйных камітэтаў, сакратароў парткомаў, парторгаў непасрэдна займаюцца справай камплектавання сеткі партасветы, справай арганізацыі партыйных школ і гурткоў.

Але не ўсюды яшчэ ўсвядомілі адказнасць і сур'ёзнасць гэтай справы. Рад раённых арганізацый і ў гэтым годзе да камплектавання школ падыходзілі механічна. У Оршы, напрыклад, на Белдрэсе ўсе таварышы механічна пераводзіліся з аднаго звяна ў другое, без адпаведнай праверкі іх ведаў. У Менску на заводзе «Большэвік» залічылі ў школу спачуваючых аднаго рабочага тав. Плісанава толькі таму, што ён спачуваючы. Калі-ж работнік культпропа ЦК праверыў яго веды, то выяснілася, што тав. Плісанаў па сваёй падрыхтоўцы ў поўнай меры падыходзіць у кандыдацкую школу.

Падобныя скажэнні не адзіночны, мы іх выпраўляем зараз на ходу, бо ў гарадах ужо заняткі пачаліся.

У гарадскіх прамысловых партарганізацыях асенне-зімовая партвучоба разгарнулася з 15-20 верасня. Першыя дні заняткаў паказалі, што ў Менску і Барысаве навучальны год сустрэлі падрыхтаванымі. Памяшканні для заняткаў і абстаноўка ў іх у большасці чыстыя і ўтульныя. Слухачы забяспечаны падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, алоўкамі, сшыткамі і т. д. На жаль, на гэту старану справы не ўсюды яшчэ звяртаюць дастатковую ўвагу. ЦК КП(б)Б абавязаў сакратароў парткомаў і іх намеснікаў, каб яны, побач з клопатамі аб прапагандысце і правільным падборы слухачоў, клапаціліся і аб стварэнні культурных умоў у вучобе. Заняткі ў чыстым, светлым і цёплым памяшканні, з неабходнымі картамі і дыяграмамі будуць спрыяць павышэнню якасці вучобы. Таму дошка і крэйда, ручка і чарнільніца, сшытак і кніга — усё гэта не дробязь, а тое элементарна неабходнае, без клопатаў аб чым не можа быць сапраўды пасяховай барацьбы за марксісцка-ленінскую вучобу. І калі ў Гомелі, Магілеве, Рэчыцы і ў частцы другіх раёнаў зусім недастатковая падрыхтаваны памяшканні да заняткаў, няма патрэбнай абстаноўкі для заняткаў, то гэта значыць, што ўжо з першых дзён вучобы частка партарганізацый пагарджае арганізацыйнай і якаснай стараной гэтай справы і не разумее важнасці культурных умоў у вучобе.

На гэту старану справы мы звачаем зараз асаблівую ўвагу ў сетцы партыйнай асветы як горада, так і вёскі.

У арганізацыі партвучобы на вёсцы мы надаем вялікае значэнне ахопу вучобай комуністаў-адзіночак. У гэтай галіне рад партарганізацый, асабліва політадзелы МТС, маюць ужо вялікі вопыт. Напрыклад, у Цялушскай МТС політадзел сістэматычна праводзіць семінары парторгаў, выклікаўшы на 2-3 дні ў політадзел адзіночак-комуністаў для вучобы.

Менскі ГК перыядычна высылае ў сельсоветы школу-перасоўку і такім чынам ахапіў вялікую частку сельскіх комуністаў вучобай. У Брысаве сістэматычна праводзіцца кароткатэрміновыя 3-5 дзённыя курсы сельскага партыйна-совецкага і калгаснага актыва. У Бабруйскім раёне ў кожнай інструктарскай зоне адкрываецца партыйны габінет, куды два разы ў месяц будуць з'язджацца ўсе парторгі калгасаў і сельсоветаў, дзе яны атрымаюць неабходную кансультацыю па сваіх прадметах. Ап рача асноўных партгабінетаў для комуністаў-адзіночак і для часткі беспартыйнага калгаснага актыва арганізаваны політшколы непасрэдна ў калгасах.

Гэтыя формы мы ў гэтым годзе шырока разгортваем на вёсцы ва ўсіх арганізацыях для ахопу вучобай комуністаў-адзіночак.

Агромаднае значэнне ў справе пасяховага разгортвання партвучобы мае своечасовае забеспячэнне падручнікамі. У дадатак да атрыманых падручнікаў з ЦК ВКП(б) мы выпускаем на беларускай мове Воліна «Палітграмата», Інгулава — «Політтуркі», Быстранскага — «Хрэстаматыя па ленінізму» і Кнорына — падручнік па гісторыі партыі. Ужо выдана на беларускай мове і рассылаецца па арганізацыях кніга тав. Сталіна— «Пытанні ленінізма». Знаходзіцца ў друку 2-томнікі выбраных твораў Леніна і Маркса-Энгельса на беларускай мове. Гэта значыць, што сетка партыйнай асветы поўнасцю забяспечваецца падручнікамі. Трэба толькі правільна іх размеркаваць, каб яны былі скарыстаны па назначэнню. Гэта таксама справа партарганізацый.

Між тым, у Магілеўскім раёне была праяўлена абыякавасць да гэтай справы. У результаце, у Магілеве дзве трэці падручнікаў — Яраслаўскага — па гісторыі партыі, Быстранскага — па ленінізму і інш., — прызначаных для сеткі партасветы, размеркавалі па інстытутах.

Найважнейшыя адносіны да размеркавання падручнікаў мелі месца таксама і ў частцы іншых раёнаў, якія скарэдзіцца цяпер на недастатковасць у забяспечанасці падручнікамі.

Зусім іншае становішча маем мы там, дзе партарганізацыі, у прыватнасці райкомы і іх сакратары, непасрэдна самі займаліся і займаюцца пытаннем падручнікаў. Прыклад сапраўдных клопатаў аб падручніках праявіў асабліва батацкі райком партыі. У результаце там нядрэнна забяспечана падручнікамі сетка партасветы, а зараз па ініцыятыве райкома камплектуюцца і хатнія бібліятэчкі комуністаў у адпаведнасці з іх узроўнем.

Гэта яшчэ раз пацвярджае, што поспех справы ў марксісцка-ленінскай вучобе комуністаў рашае ўчага і непасрэднае кіраўніцтва партарганізацый гэтай справай.

Патрабаванне тав. Сталіна: «Узняць тэарытычны ўзровень партыі на належную вышыню» абавязвае, каб сакратары парткамітэтаў і іх намеснікі займаліся-б непасрэдна пытаннямі партыйнай асветы. З гэтай мэтай ЦК КП(б)Б 15 кастрычніка праводзіць усебеларускую нараду па пытаннях партвучобы, а з 1 па 15 кастрычніка ў 10 гарадах мы праводзім канферэнцыі слухачоў і прапагандыстаў сеткі партасветы з дакладамі сакратароў райкомаў аб мерапрыемствах па разгортванню справы партыйнай асветы на зімовы перыяд.

Рашэнні ЦК ВКП(б) і ПК КП(б)Б аб разгортванні марксісцка-ленінскай вучобы далі ясную і выразную праграму работ, звязаных з падрыхтоўкай да новага навучальнага года. Гэтыя пастановы маюць буйнейшае і актуальнейшае палітычнае значэнне і павінны стаць паваротным пунктам у барацьбе ўсіх партарганізацый за ўзрост марксісцка-ленінскага ўзбраення ўсіх членаў і кандыдатаў партыі, шырокіх беспартыйных рабочых і калгасных мас на новую ступень, а таксама ў барацьбе за ўзрост палітычнай, ідэйнай асветы комсамола.

Кіруючыся гэтай пастановай, беларуская партарганізацыя арганізуе барацьбу за лепшую пастаноўку марксісцка-ленінскай вучобы. Высокая якасць большэвіцкай прапаганды і ліквідацыя летаргічных дахопаў — рашаючыя звенні ў гэтай нашай рабоце. Мы можам і павінны ўзняць работу па марксісцка-ленінскаму выхаванню комуністаў і комсамольцаў па ўзровень задач, пастаўленых XVII з'ездам ВКП(б), перад намі.

*). Канец. Пачатак гл. «Звязды» № 224.

РАСЦЕ калгасная заможнасць

Калгас імя Сталіна, Глівенскага сельсовета, закончыўшы палявыя работы і абмалот, прыступіў да размеркавання сваіх даходаў.

Сталінцы знялі ўраджай з плошчы ў 140 га. Летась сярэдні ўраджай зернавых складаў 8 цэнтнераў з аднаго гектара, а сёлета — 12 цэнтнераў.

Высокі ўраджай не прыйшоў самацёкам. Ён атрыман у результаце большэвіцкай барацьбы за высокую якасць работы. Глыбокае ворыва, ранняе ворыва, радковы пасеў, пасеў канюшыны і лубіну, правільны севазварот — вось што забяспечыла поспех. Тая зямля, на якую махнуў рукой аднаасобнік, стала даваць высокі, недасяжны для аднаасобнай гаспадаркі ўраджай.

Сёлета калгас сабраў 1.500 цэнтн. зярна, 2.200 цэнтн. бульбы, 1.960 цэнтн. кармоў (сена, канюшыны, вікі). Гэты фонд забяспечвае калгасу далейшае ўмацаванне, рэзкае павышэнне жыццёвага ўзроўню калгасніка.

Як калгас размяркоўвае гэты фонд, відаць з наступнай табліцы:

Размеркаванне (у цэнт.)

Назва культур	Валавы збор	Здача дзяржаве	Натураплата та МТС	Насенныя і страхавы фонды	Кармовы С.О.А	Інш.	Ястеца для разнас кае, на працадні
Зернавыя	1500	88	91	240	270	10	800
Бульба	2200	116	86	380	450	20	1150
Кармы	1960	30	—	—	1000	—	960

Здача дзяржаве, натураплата МТС, стварэнне насенных і кармовых фондаў ідзе першым пунктам не толькі ў табліцы размеркавання, але і на справе. Калгас ужо даўно адрозніваецца з дзяржавай, перадаў пад загад кладаўшчыка насенны і страхавы фонды, кармовы фонд перадан у распараджэнне загадчыка фермы.

Асабліва вялікая ўвага аддана справе стварэння моцнай кармовай базы для жывёлы. Калгас мае 2 фермы. На МТКФ ёсць 66 галоў буйнай рагатай жывёлы. На тольки што арганізаванай СТКФ стаіць 10 свіней. Апрача гэтага ёсць яшчэ стада авец з 32 штук. Кармовы фонд створан такі, што ён дазваляе не толькі добра забяспечыць наяўную жывёлу, але і прадугледжвае рост стада. Напрыклад, калгас мае 10 свіней, а фонд складзен на 30 штук.

Упершыню ўся жывёла поўнасцю забяспечваецца канцэнтратамі. Раней зярно адпускалася галоўным чынам для коней і свіней. А сёлета для МТФ вылучана 78 цэнтнераў зернавых культур.

Салідная астача ў 2.910 цэнтнераў сельскагаспадарчай прадукцыі размяркоўваецца на 16.000 працадзён. Наступная табліца яркa паказвае вагу працадня за 3 гады (у кілограмах):

На 1 працадз.	У 1932 г.	У 1933 г.	У 1934 г.
Зернавых	1,8	2,2	5,0
Бульба	2,0	3,5	7,0
Кармоў, уключаючы салому	4,0	7,0	13,0
Агульная вага працадня	7,8	12,7	25,0

Як бачым, з кожным новым годам калгаснік атрымлівае ўдвая больш на працадзень.

Сёлета адна з 43-х сем'яў, аб'яднаных у калгасе імя Сталіна, у сярэднім зарабляе 400 працадзён. Такім чынам адна калгасная сем'я сёлета атрымлівае 10.000 кгр., або 625 пудоў рознай сельскагаспадарчай прадукцыі. У тым ліку 20 цэнтнераў (120 пудоў) зярна, 28 цэнтн. бульбы; 320 пудоў кармоў.

Абрамовіч Ахрэм Сцяпанавіч да ўступлення ў калгас меў 3 гектары зямлі. Па словах самога Абрамовіча, ён обіраў са свайго поля 70 пудоў зярна і 200 пудоў бульбы, 100 пудоў грубых кармоў. З гэтай колькасці ішло на насенне і корм жывёле зярна 40 пудоў і бульбы 150 пуд. А кармоў зусім не хапала. Для пракармлення сям'і ў 8 душ Абрамовіч меў 30 пудоў зярна і 50 пудоў бульбы. Гэтага не хапала на трэцюю частку года.

А сёлета на 800 працадзён Абрамовіч атрымлівае 240 пудоў хлеба, 350 пудоў бульбы і безліч кармоў. Сёлета Сцяпан спакоен. Яго сям'я можа есці пшанічныя бліны (адной пшаніцы атрымаў 32 пуды), не задумваецца пра хлеб, абутак і вопратку. І яшчэ ліпкаў для продажу дзяржаве і на калгасным рынку ў Сцяпана астаецца нямала. У яго ўжо не адна, а шасцёра свіней, высокамалочная карова. Кругом задаволен Сцяпан. Ён ужо не бядняк-аднаасобнік, а заможны калгаснік.

Былы серадняк Чарнуха Іван не менш выйграў ад таго, што стаў калгаснікам. А пра батрака Лютарэвіча і гаварыць не варта. Толькі з прыходам у калгас ён стаў роўнапраўным чалавекам, знайшоў сваё шчасце.

Поўнасцю забяспечыўшы ўсе патрэбы як калгаснай гаспадаркі, так і асабіста калгаснікаў, у калгасе астаецца значная колькасць ліпкаў зярна. У сувязі з разгортваннем будаўніцтва калгас парашыў прадаць кааперацыі 5 тон зярна, каб закупіць неабходныя матэрыялы. Калгаснікі са сваіх асабістых ліпкаў прадаюць дзяржаве 3 тоны зярна для набыцця неабходных прадметаў і рэчаў.

Вось з якімі результатамі калгас імя Сталіна прыходзіць к канцу трэцяга года свайго існавання. Гэтыя поспехі ўскалыхнулі аднаасобнікаў вёскі Ухалоды. Пачаўся новы прыліў у калгас.

П. ЧЫКУН.

ШЫРЫЦЦА КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ

ЧАВУСЫ. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды».)

У сувязі з прапрацоўкай сярод шырокіх мас аднаасобнікаў пісьма тав. Гікало, у раёне мае месца значны прыліў у калгасы. За апошні месяц прынята ў калгасы звыш 1.200 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Асабліва вялікі прыліў у тых сельсоветах, дзе ў калгасах добра пастаўлена арганізацыя і ўлік працы, дзе высокая аплата калгаснага працадня.

Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца Хацкаўскі сельсавет. Тут у перадавых калгасах («III Інтэрнацыянал» і інш.) на адзін працадзень калгаснікі атрымліваюць да 6 кілограм зернавых і да 30 кгр. бульбы.

Цяпер ужо мы—смяюцца новыя калгаснікі—свае чорныя ад мякіны зубы выбелім пшанічнымі бліцамі.

У гэтым сельсавеце за апошні месяц уступіла ў калгасы 207 гаспадарак. Каля 200 гаспадарак уступіла ў калгасы ў Сухарэўскім сельсавеце.

Падача заяў аб прыёме ў калгасы з кожным днём павялічваецца.

В. Д.

БАБРУЙСК.

За апошні час у калгасы Бабруйскага раёна ўступіла 2.500 аднаасобных гаспадарак. Такіх вынікаў раён дабіўся шырокім разгортваннем партыйна-масавай, агітацыйнай работы. Агіткультпаходы калгаснікаў у пасёлкі аднаасобнікаў, пасылка да аднаасобнікаў лепшых калгаснікаў-ударнікаў у якасці «чырвоных сватоў», якія на прыкладзе свайго асабістага жыцця ў калгасе пераконвалі аднаасобнікаў у велізарнай перавазе калгаснага ладу—вось метады барысаўскай арганізацыі ў барацьбе за новы калгасны прыліў.

Асабліва вялікую ролю ў арганізацыі калгаснага прыліву адыгралі калгасныя насценгазеты-трохдзённікі, якія аб'ядналі вакол сябе вялікі калгасны актыў.

10 кастрычніка Казуліцкі сельсавет, Бабруйскага раёна, дзе ў калгасы за апошні час уступіла 400 аднаасобнікаў, падзеліцца па радыёвопытам барацьбы за новы калгасны прыліў.

Р. Ф

РЭЧЫЦА. (Па тэлеграфу).

У выніку шырокай масавай работы за апошні час у калгасы раёна ўступіла 1.500 аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Арганізавана 7 новых калгасаў. Масавы прыліў у калгасы прадаўжаецца.

КУЗНЯЦОЎ, ЦЯРЭНЦЕЎ.

БУДА-КАШАЛЁВА.

У сувязі з прапрацоўкай артыкула тав. Гікало аб новай хвалі калгаснага прыліву, масы працоўных аднаасобнікаў уступаюць у калгасы. У калгас «Граніт» уступілі 72 гаспадаркі, у калгас імя Сталіна № 2, Патапаўскага сельсавета, уступілі 203 гаспадаркі, у калгас «Трактарыст»—43 гаспадаркі і т. д. Усяго ў калгасы ўступіла каля 600 гаспадарак.

НОВІКАЎ, ПАЎЛОВІЧ.

КЛІЧАЎ.

У вёсцы Орліна, Запольскага сельсавета, арганізавана новы калгас з 48 гаспадарак.

КАПЛІНСКІ.

СУСТРЭЦЬ З'ЕЗДЫ СОВЕТАЎ НОВЫМІ ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ

Зварот Менскага гарадскога камітэта КП(б)Б, гарадскога совета і рабочых-ударнікаў перадавых прадпрыемстваў г. Менска

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Наша вялікая краіна пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ідзе да VII з'езда советаў. З трыбуны VII з'езда совецкі ўрад будзе адчытвацца перад усімі працоўнымі аб шляху, пройдзеным з часу VI з'езда советаў. З трыбуны XI з'езда советаў БССР урад Совецкай Беларусі ў канцы снежня гэтага года будзе дакладваць працоўным БССР аб перамогах сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай рэспубліцы, дасягнутых пры брацкім супрацоўніцтве з народамі ўсяго Совецкага Саюза, а з'езд советаў акрэсліць нашы далейшыя задачы.

Гэтым з'ездам прадшэствуе вялікая і адказная работа ўсіх працоўных па выбарах у сельскія, раённыя і гарадскія советы.

Працоўныя Менска поўнасцю дзлучаюцца да адозвы працоўных горада Калініна аб арганізацыі ўсесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзенне VII з'езда советаў і звяртаюцца да ўсіх працоўных, да ўсіх советаў БССР з заклікам уключыцца ў спаборніцтва, прысвечаны да VII усесаюзнага з'езда советаў і XI з'езда советаў БССР з яшчэ большымі дасягненнямі ва ўсіх галінах нашай народнай гаспадаркі, заваяваць права рапартаваць VII з'езду аб сваіх дасягненнях, змагацца за права быць занесенымі ў чырвоную кнігу імя XI з'езда советаў БССР.

Менск, у мінулым захудалы губернскі горад, які не меў прамысловасці, Менск, зруйнаваны ў 1919-20 гг. акупантамі, Менск, які атрымаў у спадчыну разбураную гарадскую гаспадарку, за 15 год совецкай улады ў БССР стаў горадам з буйнай прамысловасцю, налічваючы 63.000 чалавек рабочых і служачых, маючы да 52 буйных прадпрыемстваў з 23.148 рабочых.

Вядучыя прадпрыемствы Менска выконваюць і перавыконваюць свой промфінплан як у колькасных, так і ў якасных паказальніках. Працоўныя Менска сістэматычна выконваюць свае фінансавыя планы. План першага паўгоддзя выкананы на 119,7 проц. За выкананне плана III квартала Менскі раён занесен на ўсесаюзную чырвоную дошку.

У Менску ёсць 12 вышэйшых і 17 сярэдніх навучальных устаноў з 14.445 студэнтамі. Надзвычайна вырасла сетка рабфакаў і школ.

Зусім перабудавана і гарадская гаспадарка. Замест старых драўляных домікаў выраслі каменныя шматкватэрныя дамы. Пабудаваны універсітэцкі гарадок, Дом урада, клінічны гарадок, Дзяржаўная бібліятэка, Дом друку і Палітэхнічны інстытут. Перабудаваны і вуліцы горада. Цэнтральныя вуліцы пакрываюцца асфальтам, клінкерам, брусчаткай. Ужо ўкладзена па плану 1934 года: бульжніка — 29.273 кв. м.; брусчаткі — 2.357 кв. м. і асфальта — 2.425 кв. м.

Разгорнута вялікая работа па падрыхтоўцы да зімы. Ужо зроблена: капітальных рамонтаў у 220 рабочых кватэрах, бягучых рамонтаў у 617 кватэрах, крычым у гэту работу ўцягнута ўся грамадскасць.

Агромадныя дасягненні Менскі раён мае і ў развіцці сельскай гаспадаркі. Раён калектывізован на 75,8 проц. Соўгасы і калгасы раёна ў тэрмін і высокаякасна выканалі веснавую пасеўную кампанію, а мінімальнымі стратамі праведзена ўборка зернавых і заканчваецца ўборка бульбы, у тэрмін выкананы план асенняй сяўбы, датэрмінова выканалі хлебазадачу дзяржаве.

У результаце большэвіцкай работы калгаснікі атрымалі прадуктаў на працадзень у два разы больш чым у мінулым годзе.

За пасяховае выкананне гэтых задач Менскі раён занесен на Усесаюзную чырвоную дошку.

Усіх гэтых дасягненняў мы дабіліся пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б

Але, не гледзячы на дасягненні, у нас ёсць яшчэ шмат недахопаў.

Не ўсе прадпрыемствы выконваюць свой промфінплан. Прамысловасць Менска за 8 месяцаў недадала дзяржаве прадукцыі на 8 мільёнаў рублёў. Асабліва адстаюць завод «Ударнік», галантарэйная фабрыка імя Фрунзе, тэкстыльная фабрыка «Чырвоны тэкстыльшчык», дражджавы завод «Чырвоная зара».

Адстае самапромкааперацыя, не выпускаючы ў дастатковай колькасці прадметаў шырокага ўжытку.

Уключаючыся ў соцспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзенне перавыбараў советаў, працоўныя Менска бяруць на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Узорна падрыхтаваць і правесці перавыбары советаў, прапрацаваць на прадпрыемствах, ва ўстановах, школах, жактах і т. д. адозву ЦВК СССР і пастановы ЦВК СССР аб перавыбарах.

2. Дакладна праверыць выкананне старога наказу і арганізаваць сур'ёзную і дзелавую прапрацоўку новага наказу.

3. Выбраць лепшых ударнікаў вытворчасці ў совет, не дапускаючы праніканння ў яго класава-чужых элементаў.

4. Узорна паставіць работу масавых органаў совета, секцый і дэпутацкіх груп, з шырокім уцягненнем у работу совета працоўных жанчын і моладзі.

5. У галіне вытворча-гаспадарчых задач працоўныя Менска абавязваюцца закончыць к VII з'езду советаў наступныя буйнейшыя будоўлі: адаць у эксплаатацыю трамвайную лінію на ўзраіне горада—Серабранцы; закончыць будаўніцтва водаправодзнай насоснай станцыі; адаць у эксплаатацыю фабрыку-кухню на 65.000 блюд у дзень; поўнасцю скончыць благаўстройства рабочага Грушаўскага пасёлка і Студзянцкага гарадка; закончыць будаўніцтва новага рынка; скончыць і поўнасцю асвоіць клінкерны завод; закончыць пабудову тэхнікума сувязі; адаць у эксплаатацыю новую лазню на Серабранцы; закончыць 1-шы дом спецыялістаў на 100 кватэр; поўнасцю асвоіць ЦЭП.

Поўнасцю закончыць план благаўстройства горада на 1934 год, для чаго вылажыць бульжнікам 31.055 кв. м.; брусчаткай—3.118 кв. м., клінкерам—7.200 кв. м.; асфальтам —6.142 кв. м.

Пасадзіць 6.000 штук дрэў і 16.000 кустоў. Закончыць абсталяванне прыважальнага сквера.

6. Рабочыя калектывы перадавых прадпрыемстваў ставяць задачу перад рабочымі калектывамі адстаючых прадпрыемстваў поўнасцю ліквідаваць прарыў і выканаць промфінплан на 100 проц.

7. Рабочыя калектывы буйнейшых прадпрыемстваў, абавязваюцца:

— Завода імя Молатава—забяспечыць высокую якасць прадукцыі і знізіць сабекошт на 8 проц., арганізаваць рамонт не менш 12 рабочых кватэр.

— Рабочы калектыў швейнай фабрыкі «Окцябр» абавязаўся выпусціць звышпланавай прадукцыі на 350 тысяч рублёў, павялічыць асартымент прадукцыі, давёўшы колькасць фасонаў па жаночай вопратцы да 10 замест 8 і па дзіцячай да 5 замест 3.

— Рабочы калектыў завода «Комунар» абавязаўся датэрмінова выканаць промфінплан, даць высокую якасць прадукцыі, арганізаваць шырокую тэхнічную, забяспечыць ахоп далейшай вучобай 75 проц. зотаўцаў.

На заводзе «Большэвік» асобныя брыгады ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў, напрыклад, брыгада спругалёў 1-га хромавага цэха абавязалася выканаць промфінплан на 115 проц., знізіць брак супроць дапускаемай нормы на 60 проц., поўнасцю ўшчыльніць рабочы дзень іт. д. Такія-ж абавязацельствы ўзяла на сябе брыгада разбіўшчыкаў і інш.

Абутковая фабрыка імя Кагановіча ўзяла наступныя абавязацельствы: закончыць датэрмінова промфінплан, асвоіць выпуск клеенага бацінка, штодзённа выпускаць звыш плана 60 пар дзіцячага абутку. К 20 кастрычніка закончыць рамонт рабочых кватэр.

Рабочыя вагона-рамонтнага завода імя Мяснікова ў гонар VII з'езда советаў абязаліся конкурс на лепшую маладзёжную брыгаду. Калектыў кавальскага цэха абавязваецца за кастрычнік адрамантаваць замест планавых 53 рэсор — 65. Замест 350 таварных рэсор — 420, замест 415 тон гаечных балтоў акаваць 475 тон і т. д.

Калектыў рабочых завода імя Варашылава абавязаўся на 5 дзён раней закончыць промфінплан, падрыхтаваць не менш 200 зотаўцаў. У парадку падрыхтоўкі да зімы адрамантаваць 12 рабочых кватэр.

Такія-ж абавязацельствы ўзялі рабочыя і астатніх прадпрыемстваў горада Менска.

8. Працоўныя Менска бяруць абавязацельства выканаць гадавы фінансавы план да XVII гадавіны Окцябрскай революцыі на 85 проц.

Бяручы на сябе гэтыя абавязацельствы, працоўныя Менска заклікаюць усіх працоўных Совецкай Беларусі да большэвіцкай барацьбы за выкананне пастаноў XVII з'езда ВКП(б) і ўказанняў правадыра сусветнага пролетарыята тав. Сталіна.

Нам. сакратара гаркома КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.
Старшыня Менгорсовета ЖУКОВІЧ.
Подпісы рабочых-ударнікаў менскіх прадпрыемстваў.



У Верхняй Салдзе (Урал) заканчваецца будаўніцтва завода цяжкага моста-крана-будаўніцтва «Стальмост». Кошт будаўніцтва каля 100 мільёнаў руб лёў. Прадукцыйнасць—200.000 тон вырабу ў год. Завод будзе тэхнічна самым удасканаленым у Еўропе. Пуск намечан на 1 студзеня 1935 года. НА ЗДЫМКУ: Агульны від болтазаклёпачных варштатаў у метызным цаху «Уралстальмоста».

ПРОЛЕТАРЫІ У ВЫТВОРЧЫМ ПАХОДЗЕ ІМЯ VII З'ЕЗДА СОВЕТАЎ

ГОМЕЛЬ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Заклік рабочых завода «Серп і молат» аб арганізацыі вытворчага паходу імя VII з'езда советаў знайшоў жывы водгук у рабочых завода «Пролетарый».

Пролетарыі ўзялі на сябе абавязацельства прыйсці да з'езда советаў з перавыкананнем промфінплана, гатовую праграму закончыць да 25 снежня! Даць у гонар VII з'езда советаў на 150.000 руб прадукцыі звыш плана!

Шырока разгарнуць прадз'ездаўскае індывідуальнае спаборніцтва. Рабочыя-фармоўшчыкі помпаў т. т Гашнікаў і Кулагін абавязаліся даць 3 помпы звыш праграмы, давесці брак да нуля. Рабочыя Лазоўскі і Ліштаан абавязаліся выпусціць 5 помпаў звыш плана.

Партыйная, комсамольская і прафесіянальная арганізацыі наладжваюць улік і праверку выканання рабочымі ўзятых самаабавязацельстваў.

У вытворчым прадз'ездаўскім паходзе вялікае месца адведзена пытанням падрыхтоўкі да зімы, снабжэнню рабочых. Намечана адрамантаваць 50 рабочых кватэр, з іх 14 ужо адрамантаваны і ў 23 распачат рамонт. Заводская шаўцкая майстэрня дасць 300 пар дзіцячага абутку. Арганізавана свая кравецкая майстэрня. Рабочым — кадравікам, лепшым ударнікам, выдалі 90 парасят і для кармлення іх ЗРК выдае звыш нормы па 6 пудоў бручкі і 10 пудоў бульбы.

ПАЛЯШЧУК.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА СУРАЖСКАЙ МТС тав. ГУСЕВУ

ЦКУЮЦЬ ЗА САМАКРЫТЫКУ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

Газета паліталддзела Суражскай МТС «Сталінец» 22 верасня змясціла заметку «П'яніца Гінько разбурае калгас».

У заметцы пісалася: «Старшыня калгаса імя Дзяржынскага Гінько сістэматычна п'янствуе з кулакамі і разбазарвае калгасную маемасць. Па яго прыкладу растранжыравацца калгаснае дабро і брыгадзіры Шляхто і Сінякоў, якія сістэматычна калгаснае сена мяняюць на гарэлку». Пісалася яшчэ ў заметцы і пра рахункавода Арлова, які патурае злачынцам і сам разбазарвае калгасныя грошы.

Як толькі быў атрыман у калгасе гэты нумар газеты, Гінько схаваў яе ад калгаснікаў. Калгаснікам, якія прасілі газету, ён адказваў: «газеты няма, яна яшчэ не атрымана».

Назаўтра сабралася кампанія Гінько і пачала абмяркоўваць, як знайсці аўтараў. Нарэшце, прышлі да вываду, што заметку пісалі комсамольцы Панас Варапаеў і Яўген Багданаў.

Разгаванне паслядвала самае хуткае. Зараз-жа комсамольцаў Варапаева і Багданава паставілі на больш цяжкія работы і ў розныя брыгады. Загадчыку МТКФ комсамольцу Якушову, Гінько загадаў не пускаць Багданава і Варапаева на ферму і сачыць за імі, каб яны не сустракаліся і ні аб чым не гаварылі.

Так «комуніст» Гінько сустрэў крытыку друку.

ВАРАПАЕЎ, РАТОМСКІ, ЯКУШОЎ, БАГДАНАЎ, АГРЫСКА.

СТАРШЫНІ ЛЕЛЬЧЫЦКАГА РВК тав. ГАЎРУСЕВУ.

НЕПАРУШНЫ СЛАНОЙ

(ПІСЬМО РЭДАКТАРА ПАЛІТАДДЗЕЛЬСКАЙ ГАЗЕТЫ)

У Лельчыцкім раёне ў апошні час з'явіліся цэлыя стаі ваўкоў, якія штодзённа знішчаюць жывёлу калгаснікаў і аднаасобнікаў. Толькі за жнівень ваўкі задушылі звыш 100 галоў жывёлы.

У калгасе «Чырвоны араты» Лельчыцкага сельсовета, задушаны два рабочых коні, у калгасе «Прагрэс» — двое жарабят, у вёсцы Сіманавічы — 15 кароў, 4 свінні, 6 коней і трое парасят.

Аб гэтых фактах ужо даўно сігналізавала паліталддзельская газета, але меры не прыняты. Асаблівую бяздзейнасць праяўляе саюз паляўнічых і яго старшыня тав. Сёчка.

СКУРАТ.

СТАРШЫНІ КРЫЧАЎСКАГА РАЙПРОФСОВЕТА тав. ЛЕВІНАЙ.

ГРОШЫ УЗЯЛІ, А ДРОЎ НЕ ДАЮЦЬ

(ПІСЬМО СТУДЭНТА)

У сакавіку гэтага года ў крычаўскім гарэ хая жонка выпісала 4 метры дроў і тут-жа ўплаціла 78 руб. Дровы абяцалі даставіць на дом праз тры дні. Прайшло ўжо 6 месяцаў, а прывезлі толькі два метры. Астатнія два метры дроў і не думаюць прывозіць.

Калі я быў на канікулах у Крычаве, то я некалькі раз заходзіў у гарэ і асабіста да старшыні тав. Левіна. Левін запэўняў мяне, што дровы будуць прывезены заўтра. Прайшло з таго часу не адно «заўтра», а цэлых два месяцы, а дроў так і няма.

БАЛАКІРАЎ.

СТАРШЫНІ ПЕТРЫКАЎСКАГА РВК тав. ГРАДУ.

НЯДОУГАЯ РАДАСЦЬ

(ПІСЬМО РАБОТНІЦЫ)

Пяць год я працую поварам у сталовай дроваапрацоўчага завода «Звязда», Петрыкоўскага раёна. Увесь час знаходжуся ў надзвычай дрэнных кватэрных умовах. Пасля маіх шматлікіх заяў заводакіраўніцтва, нарэшце, дало мне кватэру ў заводскім доме. Але радасць мая была недоўгай. Праз некалькі дзён да мяне з'явіўся ў п'яным выглядзе камендант дома Дубін і прапанаваў за 30 мінут выбрацца.

Я пабегла ў фабком абскардзіць дзеянні каменданта. Але пакуль я вярнулася назад, мае рэчы былі выкінуты на вуліцу, а ў кватэру ўселі сабутыльніка Дубіна.

Пасля гэтага мяне ўселілі ў зусім непрыгодную для жылля кватэру. Скардзілася я не раз заўкому, але там не палічылі патрэбным заняцца маёй скаргай.

Е. ФРЫДМАН.

СТАРШЫНІ ПРАПОЙСКАГА РВК тав. АНДРЭЕНКА.

„ЧАКАЙЦЕ, НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ"

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКАЎ)

Мы, настаўнікі Прудкоўскай школы, Рагінскага сельсовета — (Пропойскі раён) на працягу 6 месяцаў выкладалі ў школах няграмотных і малаграматных.

Зарплату нам не выплацілі яшчэ і да гэтага часу. Старшыня сельсовета Ісаюшка Хведар і сакратар Левін заўсёды адказваюць: «Паспееце вы яшчэ атрымаць, пачакайце, не спяшайцеся».

Неадпаразовыя распараджэнні РВК, райана і райпракурора нічога не далі.

КАРАНЬКОЎ, ФЕКІН.

НАМ ПІШУЦЬ

* Пачаўся навучальны год, а памяшканне чыжэвіцкай школы Старобінскага раёна і па гэты дзень занята канцылярыяй сельсавета і ашчадкасай, — піша нам настаўнік тав. Салтан. Ведаюць аб гэтым раённыя арганізацыі, але мер пякіх не прымаюць.

* Калгаснік Аксёнаў з Сеншенскага раёна піша, што раённыя і сельскія арганізацыі з чэрвеня марынуюць справу па абвінавачванню рахункавода калгаса «Пагворыцы» Духавіча А., брыгадзіра Мандрыка С. і члена праўлення Броўка М., якія, будучы п'янымі, загналі да смерці калгаснага каня.

По слядах выступлення „Звязды"

„РУСКІЯ ШКОЛЫ ДЛЯ РУСКІХ ДЗЯЦЕЙ"

4 верасня пад гэтым загалоўкам у «Звяздзе» была надрукавана карэспандэнцыя з Гомеля. У атрыманых рэдакцыяй пастановах Наркома асветы і гомельскага гаркома КП(б)Б пацверджаецца правільнасць прыведзеных у карэспандэнцыі фактаў.

Загадчык гарана Данільчык з работы знят. Знят з работы і загадчык Мільчанскай рускай школы Казакоў, школа ўмацавана педагагічнымі кадрамі.

Гарком КП(б)Б пастанавіў уключыць у план будаўніцтва на 1935 год пабудову двух будынкаў для рускіх школ —у горадзе і Новабеліцы, партгрупе горсовета прапанавана забяспечыць існуючыя рускія школы сродкамі для абсталявання. Наркомасветы зацвердзіў выдзяленне самастойнай рускай школы з змешанай (беларуска-рускай) у Новабеліцы.

У абодвух пастановах гаворыцца аб неабходнасці хутчэйшага скончэння будаўніцтва рускай школы імя Калініна. Аднак, як паведамляе наш спецыяльны карэспандэнт, ніякіх рэальных мер для гэтага будкантора не прыняла. Гомельскаму гаркому неабходна яшчэ раз асобна заняцца гэтай справай.

ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

Селькор Я. А. з Талачынскага раёна пісаў у рэдакцыю, што дырэктар ільназавода Кавалёўскі выдаткаваў на папойку 500 руб. соўгасных грошай.

Пракурор Талачынскага раёна паведамляе, што факты расследвання устаноўлены. Гэтыя 500 руб. прызначаны для прэміравання рабочых. Кавалёўскі прыцягнут да крымінальнай адказнасці.

*** Рабочы Бэрэйка з соўгаса «Цітаса», Пухавіцкага раёна, пісаў у рэдакцыю аб тым, што дырэктар соўгаса Лазараў на-шкодніцку адносіцца да гаспадаркі.**

Уборка праведзена з вялікімі стратамі. Не лепш пастаўлена ў соўгасе і жывёлагадоўля. За ліпень, у выніку шкодніцкага догляду, здохла 20 цялят.

Лазараў напрымаў на работу класава-варожых элементаў, п'яніц і подыраў, якія разам з ім раскрадваюць маемасць соўгаса. За самакрытыку зволен з работы рабочы Юркевіч, рабочаму Амельчанку зняты два разрады і т. д.

Пухавіцкі РК КП(б)Б паведамляе, што факты поўнасцю пацверджаліся. Лазараў з работы знят і справа аб ім перадана пракурору.

За рубяжом

НОВАЯ ПЕРАМОГА КІТАЙСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ТОКІО, 6 кастрычніка (БЕЛТА). Агенцтва «СІМБУН РЭНГО» паведамляе, што, наступаючы з Цзянсі праз Хунань і Гуйчжоў 10-тысячны атрад кітайскай чырвонай арміі пад камандаваннем СЯО-КО, 3-га кастрычніка ўступіў у Сычуань і ЗЛУЧЫЎСЯ з сіламі кітайскай чырвонай арміі ХО-ЛУНА, пагражаючы гораду ВАНСЯНУ. У Вансян пасланы нанкінскія войскі генерала ЛЮ-СЕНА. У баях з чырвонай арміяй Сяо-Ко нанкінскія войскі страцілі МНОГА ТЫСЯЧ ЗАБІТЫМІ, РАНЕНЫМІ І ПАЛОННЫМІ. ЧАН КАЙ-ШЫ 5 кастрычніка прыбыў з Купіна ў Ханькоў і прыняў камандаванне войскамі, якія дзейнічаюць супроць чырвонай арміі ў Сычуані.

Газеты, якія выдаюцца ў Кобэ, пішуць, што, згодна паведамленням з Ханькоў, наступаючы з Хунані атрад кітайскай чырвонай арміі пад камандаваннем Сяо-Ко, разбіўшы 3-ю і 4-ю дывізію нанкінскіх войск, уступіў у Сычуань, заняў Бачжунг і Нілун і знаходзіцца на подступах да Чункіна, на паўднёвы ўсход ад Сычуаня. Нанкінскія войскі адступаюць па ўсяму фронту, і заняцце кітайскай чырвонай арміяй Чункіна зусім магчыма.

У Ханькоў з Чункіна 30 верасня прыбыў увесь штат германскага консульства, а таксама многа замежных і кітайскіх рэзідэнтаў, якія апасаюцца ўступлення кітайскай чырвонай арміі ў Чункін. Усё замежнае насельніцтва Чункіна тэрмінова пакідае горад.

РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ БАРАЦЬБА РАБОЧЫХ ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 6 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, **усеагульная стачка ахапіла ўсю Іспанію.** Месцамі стачка перарастаецца ў адкрытыя баі паміж узброенымі рабочымі і войскамі. У афіцыяльным паведамленні главы ўрада Легуса канстатуецца, што рэвалюцыйны рух ахапіў усю краіну.

У Мадрыдзе стачка праходзіць з выключнай арганізаванасцю. Уся прамысловасць паралізавана. Рух спынен поўнасцю. У рабочым квартале Асцюча паміж стачачнікамі і паліцыяй адбылася сутычка. Пушчаны ў ход кулямёты. Адзін забіт і два ранены. Ва ўсіх стратэгічных пунктах горада ўстаноўлены кулямёты. Арыштаваных у Мадрыдзе каля 500.

Цэнтрам падзей з'яўляецца **Астурыя.** Ва ўсіх буйных гарадах гэтай правінцыі, у тым ліку ў яе галоўным горадзе **Овіедо**, адбываюцца ўзброеныя сутычкі рабочых з паліцыяй. У вугольным раёне, каля Овіедо, **узброеныя шахцёры захвацілі ўладу ў гарадах Міерзс, Сама і Лантрэо і абвясцілі советы.** Імі ўзяты з бою і спалены казармы войск і паліцыі. У раён адпраўлены войскі суседніх правінцый. Ідзе безупынная страляніна. Шахцёры захвацілі дынамітныя патроны ў складах упраўлення шахт. Чыгуначныя зносіны паміж Овіедо і Мадрытам спынены. Войскі, накіраваныя на аўтамабілях, былі ў дарозе атакаваны рабочымі і адступілі. Згодна афіцыяльнага паведамлення, «падзеі ў Астурыі прынялі чыста рэвалюцыйны характар».

У Каталоніі ўсеагульная стачка праходзіць з поспехам ва ўсёй правінцыі. Паезды не ходзяць. Гандлююць толькі харчовыя магазіны, якія маюць дазвол стачачнага камітэта. **У горадзе Сабадэль рабочыя захвацілі ўладу. У Лерыдзе рабочымі захвачана радыёстанцыя; рабочыя па радыё заклікаюць да паўстання.** У самой Барселоне (сталіца Каталоніі) адбыліся ўзброеныя сутычкі стачачных пікетаў з паліцыяй, якая ахоўвала штрэйкбрэхераў. Аднак, выпадкі штрэйкбрэхерства адзінічны.

Арганізацыя адзінага фронта **«Аліянса обрэра»**, якая кіруе стачкай, выпусціла адозву, у якой патрабуе агалашэння аўтаномнай каталонскай рэспублікі, а таксама стварэнне іспанскай федэратыўнай рэспублікі.

Стачка поўнасцю ахапіла таксама правінцыі **Дальнс, Валенсію, Андалузію, Сан-Себастьян, Біскайю, Арагон, Вал'ядалід і Дуіпускоа.** Рабочыя захвацілі некалькі гарадоў і вёсак. Ідуць баі. У горадзе Эйбар, правінцыі Сан-Себастьян жорсткая перастрэлка.

У Біскайі рабочыя-гарнякі выступілі са зброяй супроць паліцыі. **У Рыо-Секо** (правінцыя Вал'ядалід) рабочыя кварталы зрыты акопамі. Узведзены барыкады. Рабочыя б'юцца з паліцыяй. У горадзе **Магаллон** ідуць баі.

Аналагічныя паведамленні паступаюць з мноства дробных і буйных правінцыяльных гарадоў.

ПАЎСТАННЕ ГАРНЯКОЎ АСТУРЫІ

ЛОНДАН, 6 кастрычніка. (БЕЛТА). Паводле няпоўных вестак, за ўчарашні дзень у сутычках паміж рабочымі і ўрадавымі сіламі ў розных гарадах Іспаніі, было звыш 100 забітых і 500 раненых. Лік арыштаваных вылічаецца тысячамі. Турмы перапоўнены. Арышты прадаўжаюцца. Ноччу міністр унутраных спраў меў нараду з начальнікам генеральнага штаба па пытанню аб аб'яўленні ўсеагульнай мабілізацыі узброеных сіл. Чыгуначныя зносіны па ўсёй краіне спынены. 5-га кастрычніка ноччу ад губернатара правінцыі Овіедо атрымана патрабаванне тэрмінова прысласць новыя падмацаванні. З Вальядаліда выслан у Овіедо артылерыйскі полк.

Сур'ёзная барацьба адбываецца па ўсёй Астурыі, дзе 40 тыс. рабочых гарнякоў паўсталі са зброяй у руках. З абодвух бакоў многа ахвяр. Ва многіх гарадах і вёсках рабочыя з'яўляюцца поўнымі гаспадарамі і захапілі ў свае рукі дзяржаўныя ўстановы і казармы «грамадзянскай гвардыі» (жандармерыі). Над многімі захопленымі муніцыпалітэтамі рабочыя вывесілі чырвоныя флагі.

ПАРЫЖ, 6 кастрычніка. (БЕЛТА). Паводле апошніх вестак, падзеі ў Астурыі прымаюць вельмі сур'ёзны характар. Баі прадаўжаюцца. У вугальным раёне Овіедо шахцёры ў радзе месц разабралі чыгуначнае палатно, у другіх месцах яны захапілі паезды і перакідаюць у іх свае атрады ў найбольш пагражаемыя пункты. Сутычкі носяць выключна жорсткі характар. Многа ахвяр.

У правінцыі **Сарагоса**, у гарадку Байадон, а таксама ў Рыо-Секо (правінцыя Вальядалід) рабочыя захапілі ўладу. Ідуць баі. Апархасіндыкалісцкая нацыянальная канфедэрацыя працы ў Сарагосе і Севільі забараніла сваім членам удзельнічаць у забастоўцы. Аднак, рабочыя адмовіліся падпарадкавацца.

Рэвалюцыйныя рабочыя камітэты трымаюць у сваіх руках гарады **Сабадэль, Рыпалет, Сарданола** і рад іншых прыморскіх гарадоў. Згодна апошніх даных, стачачнікі «з'яўляюцца гаспадарамі становішча ва многіх раёнах Паўночна-Заходняй Іспаніі».

Цяляты-гадавікі на пасьбішчы. (Калгас «Чырвоная зорка», Прыгараднага сельсовета, Менскага раёна).

ВІЦЕБСКІ ДЗЕНЬ

(Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Па ініцыятыве дэпутацкай групы горсовета швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» рабочы калектыў фабрыкі ўзяў шэфства над прыгараднымі пасажырскімі паездамі, курсіруючымі па маршруту Віцебск—Орша. 16 маладых ударнікаў фабрыкі выдзелены ў гэтыя паезды ў якасці праваднікоў, кандуктароў і на іншыя пасады па абслугоўванню паездоў.

Горсовет і горжылсаюз праводзяць агульнагарадскі конкурс на лепшы жакет. Для прэміравання перадавых жакетаў горжылсаюз выдзеліў прэміяльны фонд у суме 5 тысяч рублёў.

Пракладка новай трамвайнай лініі на Пролетарскую слабаду праз новапабудаваны Дзвінскі мост адбудзецца да Окцябрскіх свят. Новая трамвайная лінія злучыць Пролетарскую слабаду, дзе размешчаны рад буйных прадпрыемстваў Віцебска з цэнтрам горада.

Для праверкі выканання заключаных дагавораў на соцспаборніцтва паміж Менскам, Віцебскам і Гомелем 5 кастрычніка ў Віцебск прыбылі брыгады ад менскага і гомельскага горсоветаў.

Горпрофсовет і гарком комсамола праводзяць гарадскую алімпіяду самадзейнага мастацтва рабочай моладзі. У клубах фабрыкі імя Клары Цэткін і завода «Чырвоны металіст» будзе пастаўлена п'еса «Чужое дзіця» і інш. Драмгурток швейнікаў і панчошнік выступіць з песнямі, фізкультурнымі гульнямі і духавым аркестрам.

У СОЎНАРКОМЕ БССР

Соўнарком БССР вызначыў рад важных мерапрыемстваў па паляпшэнню супрацьпажарнай аховы.

Наркамату ўнутраных спраў прапанавана ўстанавіць нагляд за становішчам супрацьпажарнай аховы і кіраўніцтва гэтай справай.

З 1 чэрвеня на работнікаў супрацьпажарнай аховы 44 раёнаў распаўсюджана надбаўка да заработнай платы, устаноўленая пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 28 мая 1934 г. у сувязі з павышэннем цэн на нармаваны хлеб.

З 1 кастрычніка павялічана зарплата каманднаму складу пажарных каманд гарадскіх советаў і РВК у сярэднім на 20 проц.

Для рабочых і малодшага начальніцкага складу прафесіянальных пажарных каманд устаноўлена скідка ў размеры 15 проц. з асноўнай стаўкі кватэрнай платы.

Гарадскім советам і РВК прапанавана даваць старэйшаму і сярэдняму начальніцкаму складу прафесіянальных пажарных каманд кватэры бясплатна.

Рад мерапрыемстваў вызначан так сама па паляпшэнню работы добраахвотных пажарных дружын.

СНК абавязаў усіх дырэктароў прадпрыемстваў і кіраўнікоў гаспадарак і устаноў аплачваць членам добраахвотных пажарных дружын за гадзіны работы па тушэнню пажара ў рабочы час па сярэдняму заработку.

Народнаму Камісарыяту Унутраных спраў дазволена ў асноўных гарадах БССР увесці штатныя пасады палітрукоў.

200 ШВЭЙНЫХ МАШЫН ДЛЯ СТЫМУЛЯВАННЯ ХЛЕБАЗАКУПАК

СНК БССР абавязаў менскае дэпо Точмашабыта перадаць Белкаапсаюзу 100 швейных машын, віцебскае дэпо 50 машын і гомельскае дэпо—50 машын для стымулявання хлебазакупак.

ОКЦЯБРСКІЯ ПАДАРУНКІ БІРА-БІДЖАНУ

ПОЛАЦК.

У сувязі з падрыхтоўкай да святкавання XVII гадавіны Окцябра і набліжэннем першага з'езда советаў аўтаномнай Біра-біджанскай вобласці, працоўныя раёна рыхтуюць падшэфнаму Міхайлава-Сюленаўскаму сельсовету Біра-Біджана падарункі.

Сельскагаспадарчая майстэрня пасылае для калгасаў сельсовета 100 тапароў. Плодаягадны завод пасылае прадукты сваёй вытворчасці, арцель «XV гадавіна Окцябра»—швейную і картузную машыны.

З падарункамі ў Біра-Біджан выедуць прадстаўнікі рабочых арганізацый Полацка. (БЕЛТА).

У МАСКВУ І ЛЕНІНГРАД НА ОКЦЯБРСКІЯ СВЯТЫ

Беларускі совет таварыства пролетарскага турызма праводзіць запіс на масоўку ў Маскву і Ленінград на окцябрскія дні—6-7-8 лістапада. Кошт паездкі ў Ленінград—60 руб., у Маскву—55 руб. Едучым па маршруту Масква—Ленінград прадастаўляецца ільготны білет.

НАЧНЫ РЭЙС ПАРАХОДА „ЧЫРВОНЫ АРАТЫ"

БАБРУЙСК. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

1 кастрычніка параход «Чырвоны араты» зрабіў начны рэйс уніз па Бярэзіне, вядучы на буксірах дзве баркы, загружаныя бульбай. Цёмная ноч, вецер, мелкаводдзе ўскладнілі выкананне задачы.

Аднак, гэта не затрымала параход. К тром гадзінам ночы бульба была дастаўлена на прыстань. Тэрмін перавозкі яе з глыбінага пункту Міраслаўка (107 кілометраў) скарочан супроць звычайнага ўдвая.

ДОДЗІН.

НОВЫЯ ФАСОНЫ МУЖЧЫНСКАГА І ЖАНОЧАГА АДДЗЕННЯ

Белшвэйтрэст зацвердзіў на восенна-летні перыяд 1935 г. 40 фасонаў мужчынскіх касцюмаў, мужчынскіх і жаночых паліто і паліто для школьнікаў і дашкольнікаў. У мінулым годзе было толькі 18 фасонаў. У зацвярджэнні новых мадэлей прымалі ўдзел прадстаўнікі фабрык, заводаў, гандлюючых арганізацый і цэнтральнай лабараторыі Белшвэйтрэста. Лепшыя мадэлісты-канструктары і закройшчыкі—Бандарэўскі, Зайдэль, Рубінштэйн і іншыя прэміраваны. З 15 снежня швейныя фабрыкі Беларусі пераключаюцца на вытворчасць гатовага аддзення па новых фасонах.

ФІНАНСАВЫЯ РЭПРЭСІІ НА АДСТАЮЧЫЯ РАЁНЫ

За зрыў выканання фінплана трэцяга квартала Наркамфін БССР забараніў Смалявіцкаму, Камарынскаму, Брагінскаму, Чырвонапольскаму раёнам адлічэнні ў мясцовыя бюджэты сум ад паступлення па падыходнага падатку другога года другой пяцігодкі.

Пакінуты таксама раней накладзеныя фінансавыя рэпрэсіі па Бярэзінскаму, Дуброўенскаму, Веткаўскаму і Расонскаму раёнах.

З Сенненскага, Крычаўскага і Дрысенскага раёнаў, якія дабіліся ў апошні час значнага зруху ў выкананні плана мабілізацыі сродкаў, фінансавыя рэпрэсіі зняты.

10 ГОД СПАРТЫЎНАЙ РАБОТЫ тав. ЛАПІДУСА

Фізкультурная грамадскасць Беларусі адзначае 22 кастрычніка 10-гадовы юбілей спартыўнай работы аднаго з выдатных цяжкаатлётаў БССР, чэмпіёна СССР комсамольца тав. Лапідуса.

Да юбілея Вышэйшы совет фізкультуры прыўрочвае сустрэчу цяжкаатлётаў БССР, Харкава і Горкага з удзелам тав. Лапідуса. Адбудзецца таксама сустрэча па боксу з удзелам чэмпіёна СССР тав. Ёнава.

Новая маставая на рагу Совец кай і Энгельса. Вулыжнік замяняецца брусчаткай.

У ІНСТЫТУТАХ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

* * *

ІНСТЫТУТ ЯЎРЭЙСКАЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Інстытут яўрэйскай пролетарскай культуры выпускае вялікі том матэрыялаў (24 друкаваныя аркушы) «Ленін супроць Бунда».

Супрацоўнік інстытута тав. Шапкі падрыхтаваў і здаў у друк работу аб стэнатыпіі (сістэма стэнаграфавання непасрэдна на пішучай машынцы і кароткае пісьмо ад рукі).

Здаецца ў набор пробны выпуск «талковага яўрэйскага слоўніка».

Зараз друкуецца работа тав. Рэзіна «Яўрэйская буржуазія напярэдадні 1905 года». Яна паказвае на багатым гістарычным матэрыяле змычку яўрэйскай буржуазіі з агульнарускай буржуазіяй і царызмам (сіяніцкая і кадэцкая буржуазія).

Друкуецца і выйдзе к канцу года другі том з серыі трохтомніка «Першая социялістычная літаратура на яўрэйскай мове» (работа тав. Агурскага).

Гэта работа цалкам накіравана супроць ідэалізацыі Бунда і спроб зрабіць яго папярэднікам большэвізма сярод яўрэйскіх рабочых. Астатнія два томы выйдуць у першай палове 1935 года.

Падрыхтоўваецца да друку лексікон яўрэйскіх совецкіх слоў; першы том выйдзе ў 1935 годзе.

Сумесна з інстытутам яўрэйскай пролетарскай культуры Украіны заканчваюцца 4 тамы манаграфіі «Першыя пролетарскія яўрэйскія паэты і пісьменнікі».

Друкуецца і хутка выйдзе з друку бюлетэнь «На навуковым фронце» № 4-5, размерам у 14-15 друкаваных аркушаў, з артыкулам акад. С. Я. Вальфсона: «Расавыя тэорыі фашызма і класавая барацьба».

У першым картале 1935 года склікаецца канферэнцыя па марксісцкаму вывучэнню гісторыі яўрэяў, а таксама па пытанню аб вывучэнні гісторыі рэвалюцыйнага руху сярод працоўных яўрэяў.

Інстытут высылае экспедыцыю для вывучэння социяльнай рэканструкцыі мястэчак.

На працягу верасня супрацоўнікам інстытута праведзен рад публічных навуковых дакладаў на тэмы, звязаныя з іх работай у інстытуце (даклад тт. Рубіна Я., Гольмштока Х. і Гітліца).

Дырэктар інстытута АГУРСКІ.

НА ШАХМАТНЫМ ТУРНІРЫ МАЙСТРОЎ БССР, УКРАІНЫ І ЗАКАЎКАЗЬЯ

ТІФЛІС, 7 кастрычніка. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

У адзінаццатым туры (5 кастрычніка) выйгралі Рагозін у Эбралідзе і Кірылаў у Раўзера. Закончылі партыі ў нічыю Макагонаў М.—Селезнёў, Кмох—Макагонаў В. і Верасаў—Гоглідзе. Адкладзены партыі Сарокін—Сіліч і Каспаран—Канстанцінопальскі з перавагай у першых.

У дванаццатым туры (6 кастрычніка) выйгралі Рагозін у Макагонава В. (першае паражэнне Макагонава) і Кірылаў у Верасава. Закончылі партыі ў нічыю Эбралідзе—Раўзер і Макагонаў М.—Кмох. Адкладзены партыі Селезнёў—Каспаран, Сіліч—Канстанцінопальскі і Гоглідзе—Сарокін з перавагай у першых.

Становішча перад апошнім турам: Гоглідзе + 7 з 10, Макагонаў В. + 7,5 з 12, Рагозін + 6,5 з 11, Раўзер + 6,5 з 12, Верасаў 6 з 12, Селезнёў + 5,5 з 11, Канстанцінопальскі +5 з 9, Макагонаў + 5 з 11, Сіліч + 4,5 з 9, Кірылаў + 4,5 з 10, Кмох + 4 з 8, Сарокін + 3 з 8, Эбралідзе + 3,5 з 10, Каспаран + 2,5 з 9.

Майстар СІЛІЧ.

ПРАГРАМА РАДЫЁПЕРАДАЧ

(ПРАЗ МЕНСКУЮ РАДЫЁСТАНЦЫЮ ІМЯ СНК БССР).

НА 8 КАСТРЫЧНІКА

10.15. Перадача для дзяцей. Журнал «Змена змене». 16.15. Канцэрт. 17.20. Перадача для дзяцей. «Музыка дзецям». 18.00. Літаратурны мантаж на яўрэйскай мове: «Барацьба супроць рэлігіі» 19.15. Канцэрт. 19.45. У дапамогу самаадукацыі: лекцыя з цыкла «Гісторыя Беларусі». 20.15. Канцэрт. 20.45. Трансляцыя літаратурна-маладзёжнай перадачы з Оршы. 21.30. У дапамогу самаадукацыі: «Фінляндыя». 22.00. Канцэрт. 23.00. Літаратурная перадача на яўрэйскай мове. 00.05. Перадача на мове эсперанта: «Аб совецкім Кітаі».

НА 9 КАСТРЫЧНІКА

10.15. Перадача для дзяцей «Клуб юных выведнікаў» 16.15 Канцэрт. 17.20. Перадача для дзяцей: журнал «Змена змене». 18.00. Літаратурная перадача: апавяданні амерыканскага пролетарскага пісьменніка Л. Хьюза. 18.30. У дапамогу самаадукацыі: «Як уберагчыся ад грыпа». 19.15. Канцэрт. 19.45. Завочная партыйучоба. 20.45. Чырвонаармейская перадача: «Чырвоная армія на фронце социялістычнага будаўніцтва». 21.30. Перадача групы дакладаў і выступленняў: «Як працуюць ільнозаводы». 22.00. Канцэрт. Творчы вечар кампазітара Цікоцкага. 23.00. Літаратурная перадача на польскай мове: «Калгаснікі ў барацьбе за социялістычную перабудову вёскі».

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

МЕНСК

ДРОВЫ ПРАЦОЎНЫМ ГОРАДА

З 9 кастрычніка па лініі Асіповічы—Менск пачынае курсіраваць вагончык з 30 вагонаў. Вагончыка будзе штодня дастаўляць 750 метраў дроў для снабжэння рабочых горада. Гартон устанаўляе 2 аўтаматычныя цыркуляркі для распілоўкі дроў.

НАДВОР'Е СЁННЯ.

Паводле вестак бюро надвор'я, у Менску тэмпература паветра ноччу з 7 на 8 кастрычніка ад 7 да 10 градусаў, сёння днём—ад 17 да 20. Магчым праходзячы дождж. Ветры слабыя пераменных напрамкаў. Ноччу невялікі туман.

⊙ ⊙ ⊙

* СОЎГАСНА-КАЛГАСНЫЯ СПАРТАКІЯДЫ праводзяцца з 7 па 10 кастрычніка. Раённая спартакіяда назначана на 12 кастрычніка. Для правядзення раённай спартакіяды выдзелен оргкамітэт.

* 250 ТОН АСФАЛЬТУ атрымаў Белкомунгас для асфальтавання ленінскай вуліцы і вакзальнай плошчы.

* 4 ШКОЛЫ ПА ЛІКВІДАЦЫІ НЯГРАМАТНАСЦІ адкрыты ў клубе глухаманых. У клубе наладжана выдача гарачых абедаў для вучняў гэтых школ.

У скверы.

ПЕРАМОГА ЗБОРНАЙ БССР.

6 кастрычніка на стадыёне «Дынамо» адбыўся футбольны матч паміж зборнымі БССР і Ленінграда. Матч скончыўся з рахункам 3 : 2 на карысць зборнай БССР.

Вынікі матча трэба лічыць буйнай перамогай футбалістаў Беларусі. Гульня вялася культурна з абодвух бакоў. Добра судзіў ленінградскі суддя Усаў.

⊙ ⊙ ⊙

* ДВА КАНЦЭРТЫ, прысвечаныя творам Чайкоўскага і Рымскага-Корсакава, даў дзяржаўны квартэт для настаўнікаў гарадскіх школ. Інспекцыя народнай асветы заключыла дагавор з радыё-камітэтам аб арганізацыі канцэртаў у выходныя дні для школьнікаў. Тэатр юнага глядача дасць для школьнікаў 40 спектакляў.

* НОВЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ГАБІНЕТ адкрыт пры доме асветы. У габінеце сабран багаты метадычны матэрыял па пытаннях літаратуры і мовы, хіміі, гісторыі і т. д.

* ДЗЕСЯЦІДЗЕННЫЯ КУРСЫ важатых піонерскіх атрадаў арганізуе ў бліжэйшыя дні гарком комсамола.

* МАЙСТЭРНЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА ПАШЫВУ пры фабрыцы імя «8 сакавіка» значна пашыраецца. Колькасць рабочых павялічваецца з 100 да 200 чалавек.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1) сёння КАНЕЦ ДРУЖБЫ Пачатак у 8 гадзін вечр.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" Гукавы мастацкі фільм ГАРЫЗОНТ У фай—канцэрт аркестра

Кіно-тэатр „Пролетарый" Мастацкі фільм НАТЭЛЛА У фай—канцэрт муз-джаза

Кіно „СПАРТАК" Ад 8 кастрычніка НОВЫ УСХОДНІ ФІЛЬМ МЗАГО і ГЕЛЛА драма ў 6 частках. У праграме—кіно-хроніка. ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ. | К СА—з 4 г дня

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Ад 7 кастрычніка совецкі мастацкі фільм „Вялікае горэ маленькай жанчыны" У ГАЛОЎНАЙ РОЛІ— ЗОЯ ВАЛЕЎСКАЯ. У праграме кіно-хроніка САЮЗКІНО

ЗГУБЛЕНА ПЯЧАТКА Валосавіцкай НСШ. Усе дакументы завераныя, з 30-VIII—1934 г., лічыць несапраўднымі.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛАНС БЕЛКААППРОМСОВЕТА НА 1-е СТУДЗЕНЯ 1934 г.

АКТЫЎ:

№№ гал. рах.	НАЗВА ГАЛОЎНЫХ РАХУНКАЎ	АГУЛЬНАЯ СУМА		Проц. да бал.
1	Маёмасць	310.320	25	8,8
4	Каштоўныя паперы	904.865	00	25,7
5	Паі і акцыі	9.500	00	0,3
6	Спец. уклады ў крэдытн. уст.	295.515	59	8,4
7	Мэт. доўгатэр. пазыкі выд.	1.142.141	85	32,4
8	Няпэўныя даўгі	195.377	63	5,5
9	Выдаткі наступн. часу	119	25	—
10	Каса	323	57	—
12	Разліковыя рах. у банку	37.487	67	1,1
19	Тавары і матэрыялы	5.983	70	0,2
25	Падсправаздачныя асобы	1.695	40	—
29	Розныя разлікі	24.017	77	0,7
32	Узаемныя разл. з прам. саюз	594.634	84	16,9
67	Рабочыя і служачыя	596	58	—
	БАЛАНС: руб.	3.522.579	10	100.0

ПАСІЎ:

№№ гал. рах.	НАЗВА ГАЛОЎНЫХ РАХУНКАЎ	АГУЛЬНАЯ СУМА		Проц. да бал.
53	Асноўны капітал	1.437.830	45	40,8
54	Паявы „	457.913	37	13,0
55	Зваротны „	84.555	35	2,4
56	Спецыяльныя „	321.750	44	9,1
57	Розныя фонды	446.721	96	12,7
60	„ рэзервы	195.377	63	5,5
62	Мэт. доўгатэр пазыкі	309.040	98	8,8
25	Справаздачныя асобы	450	75	—
29	Розныя разлікі	65.581	47	1,9
32	Разлікі з спец. с. сістэмы	101.856	96	2,9
67	Рабочыя і служачыя	6.875	56	0,2
84	Дэпаненты	70	77	—
—	Вынікі справазд. года	94.553	41	2,7
	БАЛАНС: руб.	3.522.579	10	100.0

ДЭБЕТ — РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ ЗА 1933 г. — КРЭДЫТ

№№ рах.	ВЫДАТКІ	СУМА	
48	Адміністр гаспадарчыя выдаткі	183.909	20
49	Проц. і камісія ўплоч.	68.761	93
52	Адлічэнні ВСПК	266.195	00
84	Фонд на пакр. няпэўн. доўг.	147.868	32
	УСЯГО р.	656.734	45
	Прибыткі за 1933 г.	94.553	41
	РАЗАМ р.	751.287	86

№№ рах.	ПРЫБЫТКІ	СУМА	
81	Проц. і кам. атрым.	52.734	15
82	Ад эксплаатацыі маем.	[illegible]	41
83	Ад адліч. ніж. звенняў і розных	[illegible]	30
	УСЯГО р.	[illegible]	86
	РАЗАМ р.	[illegible]	86

Старшыня Белкааппромсовета БРЫСКІН. Галоўбух ПО[illegible].

ПАСТАНОВА № 17

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

ад 29 верасня 1934 г.

Аб бягучых зменах у рабоце па інвентарызацыі па г. Менску.

1. За парушэнне абавязковай пастановы горсовета ад 1 красавіка 1934 г. аб дачы жыл зем. кіраўніцтву вестак аб зменах па бягучай інвентарызацыі—АШТРАФАВАЦЬ НАСТУПНЫХ АСОБ на 100 р. кожнага;

1. ДАН—інстытут народнай гаспадаркі (Пляц Волі, 21).
2. КАТЛОЎСКІ—заг. дамамі жакта № 2.
3. БІРК „ „ „ № 10.
4. СЯМЁНАЎ—дырэктар Белхартгандлю (пляц Волі, 7).
5. АЛЬПЕРОВІЧ—заг. дамамі жылтрэста № 68-29, рог Совецкай і Комсамольскай.
6. ЮРКЕВІЧ—заг. гаспадаркі Белдзяржпраекта, Рэволюцыйная, 3.

Прапанаваць міліцыі спагнаць штраф з гэтых асоб на працягу 10-ці дзён.

Старшыня Менгорсовета ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менгорсовета ІПАТАЎ.

Даводзіцца ДА ВЕДАМА СТУДЭНТАЎ 2 і 3 курсаў 3-гадовага аддзялення ВИСГШ, што заняткі пачынаюцца 16 кастрычніка, у 8 гадзін раніцы.

Адзі окаму ПАТРЭБЕН невялікі ПАКОЙ. Пажадана ў цэнтры. Аплата па згодзе. Аб умовах звяніць па тэлефону 21-360

Пры менскім дашкольным тэхнікуме АДКРЫВАЕЦЦА ВЯЧЭРНІ ДАШКОЛЬНЫ ТЭХНІКУМ на 70 вас
35 асоб на 1 курс
35 асоб на II курс.
На 1 курс прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку, на II курс—скончыўшыя 8-годку.
Тэрмін навучання—3 гады без адрыву ад вытворчасці.
Заявы разам з дакументамі і накіндыроўкай гор. і раёна накіроўваць на адрас: Менск, Барысаўскі тракт 55, дашкольны тэхнікум

ВУЧЭБНЫ КАМБІНАТ БЕЛ. АДДЗ. „СОЮЗОРГУЧЕТ" АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР КУРСАНТАЎ на 5-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы бухгалтароў для сістэмы БЕЛТОРФА (на торфзаводах Белторфа).
Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй ад 110 да 140 р. у месяц у залежнасці ад акадэмпаспяховасці і кватэрнымі на 25 р. у месяц. Курсанты прымаюцца да сталоўкі. На курсы прымаюцца асобы, якія маюць стаж рахунковай працы не менш двух год і адукацыю не ніжэй 7 груп сямігодкі.
Да заяў патрэбна далучыць наступныя дакументы: аб асвеце, працоўным стажы, аслабаненні ад працы, соц. паходжанні, метрыч. выпіс.
Падача заяў да 20-га кастрычніка г. г. Аб залічэнні і пачэтку заняткаў будзе паведамлена па пошце.
Для адказу патрэбна прыкласці марак на 40 кап. Заявы без выпісанага дакумента разглядацца не будуць. Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: г. Менск, Міхайлаўская вул., № 1-4, навуч. камбінату «Союзоргучет». Канцылярыя курсаў там-жа, ад 8-й да 10 з паловай гадзін вечара.
ДЫРЭКТЫЯ.

Рэдакцыі газеты „ЗВЯЗДА" ПАТРЭБНЫ МАШЫНІСТКІ, якія добра ведаюць беларускую мову. Звяртацца да сакратара рэдакцыі.

Выпускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж—Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер—Е. КАГАН, ст. друкар—АНУЧЫН.

Менск, друкарня «Звязды». Уп. Галоўлітбела № К—3258.